STRENGTHENING
**CIVIL SOCIETY**
GLOBALLY




# 2017 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - БЕЛАРУСЬ

ВЕРАСЕНЬ 2018


USAID
FROM THE AMERICAN PEOPLE

ICNL

fhi360
THE SCIENCE OF IMPROVING LIVES

# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - 2017

## КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ, БЕЛАРУСЬ

## ВЕРАСЕНЬ, 2018

Складальнікі:
Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці
Бюро па справах дэмакратыі, канфліктах і гуманітарнай дапамозе
Цэнтр перадавога вопыту ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і кіравання

У партнёрстве з FHI 360 і Міжнародным цэнтрам некамерцыйнага права (ICNL)

Гэтае выданне стала магчымым дзякуючы падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці ў межах Пагаднення аб супрацоўніцтве
№ AID-OAA-LA-17-00003

Фота на вокладцы: Хакатон сацыяльных праектаў Social Weekend (18-19 лютага 2017 года), які сабраў каля 300 чалавек для распрацоўкі карысных для грамадства ідэй і праектаў.

Крыніца: Конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend

*Усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, з'яўляюцца асабістым пунктам гледжання экспертаў, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы справаздачы, і не абавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання USAID або FHI 360*

# УВОДЗІНЫ

Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID) прадстаўляе дваццаць першае выданне *Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС) краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі* за 2017 год.

У 2017 годзе USAID працягваў працаваць з шырокім колам партнёраў, у тым ліку з грамадзянскай супольнасцю, для прасоўвання прынцыпаў самастойнасці і ўстойлівага развіцця на мясцовым узроўні. Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці дае ўсебаковую ацэнку патэнцыялу грамадзянскай супольнасці ў якасці партнёра па рэалізацыі рашэнняў у кароткатэрміновай перспектыве, так і суб'екта, які забяспечвае ўстойлівасць доўгатэрміновых вынікаў. Індэкс дае магчымасць грамадзянскай супольнасці ацаніць не толькі асяродак, у якім яна дзейнічае, але і ўласны патэнцыял, неабходны для адвакатавання, забеспячэння ўстойлівай дзейнасці і падтрымкі сувязяў з грамадскасцю. Магчымасць для грамадзянскай супольнасці самастойна выяўляць праблемы ў сваім развіцці – гэта першы крок да фармавання жыццяздольнасці і трывалай самастойнасці.

Сёлетні Індэкс змяшчае справаздачы па АГС у 24 краінах рэгіёну, ад краін Балтыі на поўначы да Каўказа на поўдні, ад краін Вышаградскай групы на захадзе да Расіі, якая палягае на ўсход да Ціхага акіяна. Індэкс аналізуе поспехі і няўдачы ў фармаванні ўстойлівасці АГС па сямі ключавых кампанентах або параметрах: прававы асяродак, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктура сектара і грамадскі імідж. Індэкс прызначаны служыць карыснай крыніцай інфармацыі для мясцовых АГС, дзяржаўных органаў, донараў, акадэмічнай супольнасці і іншых асобаў, якія імкнуцца лепш разумець ключавыя аспекты ўстойлівасці сектара АГС і кантраляваць іх.

Метадалогія Індэкса абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ў кожнай краіне фармуюць экспертную групу для ацэнкі і ранжыравання параметраў

устойлівасці АГС за год. Экспертная група ўзгадняе балы па кожным параметры ў дыяпазоне ад 1 (устойлівасць высокая) да 7 (устойлівасць нізкая). Потым падлічваецца сярэдняя велічыня па ўсіх выстаўленых балах і атрымліваецца агульны бал устойлівасці сектара АГС у кожнай краіне. Рэдакцыйная калегія, якая складаецца з тэхнічных і рэгіянальных экспертаў, рэцэнзуе балы і суправаджальную апісальную справаздачу кожнай экспертнай групы – гэта да зваляе захоўваць аднастайны падыход і стандарты для параўнання розных краін. Больш падрабязная інфармацыя пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання суправаджальных тэкставых справаздач можна знайсці ў поўнай версіі Індэкса на англійскай мове на сайце USAID.

Індэкс устойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі дапаўняе аналагічныя публікацыі па іншых рэгіёнах: *Індэкс устойлівасці АГС краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары* ацэньвае сектар грамадзянскай супольнасці ў 31 краіне; *Індэкс устойлівасці АГС краін Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі* ахоплівае 7 краін; *Індэкс устойлівасці АГС краін Азіі* ўключае справаздачы па 9 краінам. Такім чынам, усе выданні Індэкса ўстойлівасці АГС у 2017 годзе змяшчаюць інфармацыю агулам па 71 краіне.

# АГЛЯД СІТУАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ

Індэкс устойлівасці АГС краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі 2017 года дае інфармацыю пра арганізацыі грамадзянскай супольнасці, якія валодаюць розным патэнцыялам і развіццё якіх ідзе па розных траекторыях. 21 год таму, калі Індэкс быў апублікаваны ўпершыню, , існавала надзея, ці нават гіпотэза, што ўстойлівасць АГС ва ўсіх краінах і рэгіёнах будзе паступова паляпшацца, і тыя, якія маюць больш нізкі ўзровень устойлівасці, дагоняць тых, хто валодае больш высокім узроўнем (што адбылося збольшага ў краінах Паўночнай групы), і ўрэшце ўсе дасягнуць стану «Устойлівасць высокая» ці прыблізна таго. Аднак мы з'яўляемся сведкамі сітуацыі, калі такія краіны, як Венгрыя і Польшча, якія гістарычна мелі адзін з самых высокіх узроўняў устойлівасці, цяпер сутыкаюцца з сур'ёзнымі пагрозамі, у той час як шэраг краін Еўразіі, у тым ліку Арменія, Малдова і Украіна, ужо некалькі год паказваюць рост. Такім чынам, збліжэнне адбываецца бліжэй да сярэдзіны шкалы Індэкса, а не на самым высокім яе ўзроўні.

Сектары АГС у 24 краінах рэгіёну, ахопленага дадзеным выданнем Індэкса, па-ранейшаму размяшчаюцца па ўсім спектры ўстойлівасці. Эстонія, як і раней, мае найвышэйшы ўзровень не толькі сярод краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, але і астатніх краін, якія ацэньвае Індэкс. АГС у Эстоніі, а таксама ў большасці іншых краін Балтыі і Вышаградскай групы, дзейнічаюць ва ўмовах спрыяльнага прававога асяродку, валодаюць моцным арганізацыйным патэнцыялам, эфектыўна адвакатуюць і аказваюць паслугі высокай якасці. Хаця фінансавая ўстойлівасць па-ранейшаму застаецца адным з самых слабых параметраў, АГС у гэтых краінах маюць доступ да разнастайных крыніцаў фінансавання, у тым ліку да дзяржаўных грантаў і кантрактаў, а таксама прыватных і карпаратыўных сродкаў.

На супрацьлеглым баку шкалы знаходзяцца Беларусь і Азербайджан, дзе АГС працягваюць працаваць у несприяльных прававых варунках, якія абмяжоўваюць доступ да фінансавання, асабліва замежнага, і даюць мала магчымасцяў займацца адвакатаваннем. АГС у гэтых краінах валодаюць слабым арганізацыйным патэнцыялам і карыстаюцца невялікай грамадскай падтрымкай. Сітуацыя для АГС у Расіі не нашмат лепшая, чым у Беларусі і Азербайджане.

Памеры сектараў у 24 краінах, ахопленых дадзеным Індэксам, вар'іруюцца таксама, як устойлівасць сектараў і памер саміх краін. У Расіі, якая мае найбольшую колькасць насельніцтва ў параўнанні з іншымі краінамі, уключанымі ў выданне, налічваецца 221 тысяча афіцыйна зарэгістраваных некамерцыйных арганізацый, тады як у Чарнагорыі, краіне з найменшым насельніцтвам, зарэгістравана менш за 5 тысяч арганізацый. Аднак важна адзначыць, што афіцыйная колькасць зарэгістраваных АГС не заўсёды дае дакладную карціну сапраўднага памеру сектара. Шмат якія грамадскія групы працуюць без афіцыйнай рэгістрацыі і, такім чынам, не ўлічваюцца афіцыйнай статыстыкай. У той жа час існуе вялікая колькасць арганізацый, якія ўлічаны ў рэестрах, але больш не функцыянуюць.

Стан АГС па-ранейшаму шмат у чым залежыць ад палітычнага і эканамічннага кантэкста. Цягам 2017 года ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі АГС адчулі на сабе ўплыў наступных фактараў:

## *Антыдэмакратычны адкат*

У краінах, якія ўключаныя ў Індэкс устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, ўсё часцей праяўляюць сябе ўрады, варожыя да дэмакратычных нормаў, практык і інстытутаў. Хаця такая з'ява даўно назіраецца ў Еўразіі, антыдэмакратычныя ўрады зараз становяцца ўсё больш пашыранай з'явай палітычнага ландшафту ў самым сэрцы Еўропы. Паводле даследавання Freedom House «Развіццё дэмакратыі ў краінах пераходнага перыяду» (2018 Nations in Transit), «у 2017 годзе нелібералізм усталяваўся ў якасці новай нармальнасці, якая распаўсюджана ад Цэнтральнай Еўропы да Еўразіі. У Цэнтральнай Еўропе ўрады, якія грэбуюць незалежнымі інстытутамі і спрабуюць

аб'яднаць кіроўную партыю з дзяржавай, ужо не з'яўляюцца выключэннем».

Венгрыя і Польшча з'яўляюцца ілюстрацыйнымі прыкладамі гэтай тэндэнцыі. Абедзве краіны спрабуюць абмежаваць свабоду СМІ і паслабіць незалежную судовую сістэму. У Македоніі больш за 10 год кіравала партыя, якая валодала амаль поўнай уладай і не трывала іншадумства. У даследаванні «Развіццё дэмакратыі ў краінах пераходнага перыяду» адзначаецца, што прэзідэнты Аляксандр Вучыч у Сербіі і Міла Джуканавіч у Чарнагорыі «захапілі свае дзяржавы і ператварылі іх у механізмы распаўсюду патэрналізму, які, у сваю чаргу, узмацняе ўладу іх партый».

У такіх варунках АГС змагаюцца за тое, каб іх галасы былі пачутыя, але тыя, хто выказвае крытыку на адрас улады, часта ператвараюцца ў аб'екты паклёпніцкіх кампаній, пра што больш падрабязна апісана ніжэй.

Рост нацыяналізму і ксенафобіі ідзе поруч з ростам нелібералізму. У Польшчы, напрыклад, вынікі апытанняў пацвярджаюць, што палякі ўсё менш сімпатызуюць прадстаўнікам іншых краін, а колькасць фізічных і вербальных нападак на замежнікаў павялічваецца. У Румыніі новы ўрад быў абраны з праграмнай платформай, якая ўключала рыторыку пра абарону нацыянальнай ідэнтычнасці. Урад Венгрыі распачаў «нацыянальныя кансультацыі» і распаўсюдзіў анкеты, каб сабраць меркаванні адносна мігрантаў, сярод усіх грамадзянаў выбарчага ўзросту. Аднак пытанні былі сфармуляваныя такім чынам, каб падтрымаць антыміграцыйную пазіцыю ўрада.

## *Выбары*

Выбары здольныя рэзка змяніць асяродак, у якім дзейнічаюць АГС, пра што сведчыць сітуацыя 2017 года ў Македоніі. Выбары, праведзеныя ў Македоніі ў снежні 2016 года, сталіся прычынай працяглага палітычнага крызісу. Нарэшце, у траўні Сацыял-дэмакратычны саюз Македоніі (SDSM) сфармаваў новы ўрад, чым скончыў 11-гадовае кіраванне Унутранай македонскай рэвалюцыйнай арганізацыі – Дэмакратычнай партыі за македонскае нацыянальнае адзінства (VMRO-

DPMNE), якая істотна звузіла прастору грамадзянскай супольнасці і ў часе знаходжання на чале ўлады жорстка спыняла ўсялякае іншадумства. Фармаванне новага ўрада адкрыла ў другой палове года шматлікія магчымасці для АГС удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў і супрацоўнічаць як з нацыянальнымі, так і з мясцовымі органамі ўлады.

Адваротная сітуацыя склалася ў Румыніі, дзе парламенцкія выбары таксама адбыліся ў снежні 2016 года. Новы ўрад абраў у дачыненні да АГС варожую пазіцыю, выкрываючы іх як замежных агентаў, якія дзейнічаюць супраць нацыянальных інтарэсаў, і гэта прывяло да пагаршэння амаль усіх параметраў Індэкса ўстойлівасці АГС.

Выбары не заўсёды прыводзяць да такіх істотных зменаў. Цягам 2017 года ў шэрагу краін, у тым ліку ў Албаніі, Арменіі, Балгарыі і Косава, прайшлі чарговыя парламенцкія выбары. Дзейныя ўлады захавалі свае пазіцыі ў Албаніі, Арменіі і Балгарыі, а ў Косава датэрміновыя выбары прывялі да стварэння кааліцыйнага ўрада, у які ўвайшлі некалькі новых партый. АГС бралі на сябе розныя ролі на гэтых выбарах, у тым ліку адукацыю выбарцаў, кампанію «Ідзі і галасуй!», маніторынг кандыдатаў і маніторынг выбараў.

### *Карупцыя*

Карупцыя – праблема, якой АГС займаюцца даўно, працягвала заставацца сапраўдным бедствам для шмат якіх краін, уключаных у Індэкс устойлівасці АГС. У Латвіі ўвага грамадскасці цягам года была звернутая да так званых «размоваў алігархаў» – запісаў размоваў некалькіх цяперашніх і былых палітыкаў і ўплывовых бізнесменаў, якія абмяркоўвалі, як арганізаваць палітычныя і іншыя працэсы на сваю карысць. Латвійская грамадскасць была абураная і патрабавала справядлівасці і тлумачэнняў ад тых, хто быў у гэта ўцягнуты. І хаця для расследавання інфармацыі была створаная камісія і апублікаваная справаздача з агульнымі рэкамендацыямі па ўдасканаленні следчых органаў, ніякіх канкрэтных крокаў зроблена не было.

У Румыніі новы ўрад прыняў напрыканцы студзеня надзвычайную пастанову, якая знізіла крымінальную адказнасць за некаторыя

злачынствы, звязаныя з карупцыяй. Гэта справакавала самыя вялікія ў сучаснай гісторыі Румыніі пратэсты, калі да 600 тысяч чалавек па ўсёй краіне выйшлі на вуліцы гарадоў; у выніку менш чым праз месяц спрэчнае пастанова была скасаваная. У Славакіі вялікую ўвагу прыцягнулі дзяржаўныя закупкі па завышаным коштце, зробленыя Міністэрствам замежных і еўрапейскіх справаў у перыяд старшынства Славакіі ў Радзе ЕЗ.

У Расіі, дзе карупцыя абмяркоўваецца не вельмі публічна, у дзясятках гарадоў прайшлі антыкарупцыйныя дэманстрацыі. У некаторых гарадах, у тым ліку ў Маскве і Санкт-Пецярбургу, такія дэманстрацыі не былі санкцыянаваныя ўладамі і прывялі да затрымання тысяч людзей, у асноўным, моладзі.

Карупцыя засталася праблемай у краінах, якія імкнуцца ўступіць у Еўрапейскі Звяз. Так, напрыклад, барацьба з карупцыяй ужо даўно вызначаная ў якасці сферы, дзе Албанія і Чарнагорыя павінны былі правесці дадатковыя рэформы, каб працягнуць працэдуру ўступлення ў ЕЗ. У дакладзе па Косава адзначаецца, што да сённяшняга дня ніводная палітычная справа аб карупцыі на высокім узроўні ў краіне не была паспяхова завершаная. Гэтую праблему ілюструе той факт, што сябрам парламента, якім было высунутае абвінавачванне ў махлярстве, растраце і адмыванні грошай, па-ранейшаму дазволена ўдзельнічаць у парламенцкай дзейнасці, нават пад хатнім арыштам.

Тым не менш, цягам года некалькі краін распачалі намаганні па барацьбе з карупцыяй. Арменія, Македонія і Украіна прынялі планы рэформаў і заканадаўчыя захады, накіраваныя на скарачэнне карупцыі.

### *Міжнародныя органы і механізмы*

Міжнародныя і рэгіянальныя органы, асабліва ЕЗ, у значнай ступені ўплывалі на краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Сяброўства ў ЕЗ па-ранейшаму з'яўляецца адным з важных арыенціраў для краін, якія ўключаныя ў Індэкс. Адзінаццаць з іх ужо з'яўляюцца сябрамі ЕЗ[1]. Яшчэ чатыры краіны – Албанія, Македонія, Чарнагорыя і

[1] Краіны ЕЗ, уключаныя ў Індэкс: Балгарыя, Венгрыя, Латвія, Літва, Польшча, Румынія, Славакія, Славенія, Харватыя, Чэшская Рэспубліка і Эстонія.

Сербія – краіны-кандыдаты, а Косава, Боснія і Герцагавіна з'яўляюцца патэнцыйнымі кандыдатамі. Краіны-кандыдаты і патэнцыйныя кандыдаты у 2017 годзе працягвалі прыкладаць намаганні для ўступлення ў ЕЗ. Напрыклад, у Босніі ўлады працавалі над запаўненнем апытальніка ЕЗ, што з'яўляецца знакавым крокам на шляху краіны да сяброўства ў ЕЗ, і, урэшце, падалі яго ў пачатку 2018 года. Грамадзянская супольнасць зрабіла свой унёсак у гэты працэс, падрыхтаваўшы адказы на больш чым 700 з 3,200 пытанняў. АГС таксама працавалі сумесна над падрыхтоўкай альтэрнатыўных адказаў для апытальніка. У адпаведнасці з Планам дзеянняў Сербіі па раздзелах 23 і 24 працэсу ўступлення ў ЕЗ, урад Сербіі ў 2017 годзе арганізаваў працэс унясення паправак у канстытуцыю краіны, дзе асноўная ўвага надавалася судовай рэформе. Новы ўрад Македоніі паабяцаў актывізаваць працэсы ўступлення ў ЕЗ і НАТА.

Краіны Еўразійскага рэгіёну таксама працягвалі спробы ўсталявання больш шчыльных стасункаў з ЕЗ. У лістападзе Арменія і ЕЗ падпісалі Пагадненне аб усёабдымным і пашыраным партнёрстве (Comprehensive and Enhanced Partnership Agreement – CEPA) у мэтах умацавання супрацоўніцтва ў пытаннях бяспекі, паляпшэння інвестыцыйнага клімату і садзейнічання развіццю грамадства і бізнесу. У сакавіку 2017 года грамадзяне Грузіі атрымалі ад ЕЗ бязвізавы рэжым, які дазволіў уладальнікам біяметрычных пашпартоў уязджаць у Шэнгенскую зону без візы на 90 дзён цягам 180-дзённага перыяду на адпачынак, па пытаннях бізнесу і з любой іншай мэтай, акрамя ўсталявання на працу. Аднак у краіне па-ранейшаму назіраецца высокі ўзровень палярызацыі ў дачыненні да ЭЗ. Хаця агульная падтрымка ідэі далучэння да ЕЗ застаецца высокай, шырокі распаўсюд дэзынфармацыі ў краіне спрыяў значнаму зніжэнню грамадскага даверу да ЕЗ як інстытута. Паводле звестак Каўказскага Барометра, штогадовага апытання, якое ладзіць Каўказскі рэсурсны даследчы цэнтр (CRRC), за апошні пяць год давер да ЕЗ знізіўся з 42% да 33%.

Індэкс устойлівасці АГС ахоплівае вельмі разнастайны спектр краін і сектараў АГС. Аднак у краінавых дакладах за 2017 год адзначаныя некаторыя агульныя тэндэнцыі.

## ЗВУЖЭННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПРАСТОРЫ

Тэндэнцыя да звужэння грамадзянскай прасторы была добра адлюстраваная ў апошніх выданнях Індэкса ўстойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Яна мела працяг і ў 2017 годзе, калі ўрады ў самых розных краінах – як у сталых сябраў ЕЗ у Паўночнай групе, так і краінах, дзе ўжо даўно кіруюць рэпрэсіўныя рэжымы (Беларусь і Азербайджан), – робяць яшчэ больш жорсткім кантроль над грамадзянскім сектарам. Гэта адбываецца ў самых розных формах, але, як правіла, дзеянні ўладаў скіраваныя на абмежаванне доступу АГС да фінансавання, павышэнне патрабаванняў да справаздачнасці і пераслед АГС, якія крытыкуюць працу ўрада або якія патрабуюць прыцягнуць урад да адказнасці за сітуацыю ў краіне.

Звужэнне грамадзянскай прасторы выявілася ў тым, што 12 краін – палова з уключаных у дадзенае выданне Індэкса – адзначылі ў 2017 годзе пагаршэнне прававых варункаў для АГС. Асобна варта адзначыць той факт, што ў 5 з 9 краін Паўночнай групы, дзе прававы асяродак цягам апошніх дзесяці год быў у значнай ступені спрыяльным, у 2017 годзе ўведзеныя заўважныя прававыя абмежаванні. Сітуацыя ў Венгрыі сталася адной з самых вострых. У 2017 годзе Венгрыя прыняла закон «аб празрыстасці арганізацый, якія падтрымліваюцца з-за мяжы», вельмі падобны на расійскі закон аб «замежных агентах».

Гэты закон патрабуе, каб АГС, якія атрымліваюць сродкі больш вызначанага памеру з неайчынных крыніцаў (дзяржаўных ці прыватных), мусяць рэгістравацца як «тыя, хто мае замежнае фінансаванне» і ўжываць гэты цэтлік на сваіх вэб-сайтах і ва ўсіх публікацыях. Арганізацыі, якія парушаюць гэты закон, падпадаюць пад санкцыі, якія могуць прывесці да штрафаў ці нават роспуску арганізацыі. За апошнія некалькі год пагаршэнне заканадаўчага поля ў Венгрыі было звязанае з пераследам АГС, якія крытыкуюць урад, але гэта першы выпадак, калі ў краіне ўведзеныя абмежавальныя прававыя нормы.

Урад Польшчы таксама рабіў захады па ўзмацненні кантролю над сектарам, у тым ліку за фінансаваннем АГС. Парламент, у прыватнасці, прыняў закон аб стварэнні новага агенцтва, якое наўпрост

падпарадкоўваецца прэм'ер-міністру і якое заклікане размяркоўваць усе сродкі – дзяржаўныя, еўрапейскія і іншыя міжнародныя, – скіраваныя на развіццё грамадзянскай супольнасці. Рост адміністрацыйных перашкод і пераследу таксама замінalі працы АГС, асабліва тых, якія выказвалі нязгоду з дзяржаўнай палітыкай ці адрозны ад дзяржаўнай ідэалогіі пункт гледжання. Акрамя таго, група дэпутатаў распрацавала законапраект, які забараняе замежнае фінансаванне АГС, і прадставіла гэты дакумент на прэс-канферэнцыі ў парламенце.

Змены ў Чэшскай Рэспубліцы і Літве былі менш сур'ёзнымі, але таксама засведчылі тэндэнцыю да большага кантролю над АГС. У Чэшскай Рэспубліцы ўрад націснуў на АГС і прымусіў іх стаць больш празрыстымі датычна крыніцаў фінансавання, а таксама ўвёў новыя адміністрацыйныя працэдуры, звязаныя з онлайн рэгістрацыяй продажу і штомесячнага дэкларавання ПДВ. У Літве новыя рэгуляцыі таксама патрабуюць, каб АГС давалі звесткі пра сваіх донараў. Сектар разглядае гэтыя захады як узмацненне кантролю дзяржавы над АГС. Прававы асяродак у Латвіі пагоршыўся ў звязку са зменамі ў падатковай сістэме, што негатыўна адаб'ецца на фінансавай устойлівасці сектара АГС у доўгатэрміновай перспектыве.

Нягледзячы на тое, што негатыўныя змены ў краінах Паўднёвай групы былі не такімі маштабнымі, як у Паўночнай групе, паўднёвыя краіны, сярод якіх Македонія, Румынія і Сербія, таксама адзначылі пагаршэнне прававога асяродку ў 2017 годзе. Ва ўсіх трох краінах пераслед АГС з боку ўладаў стаўся важным фактарам развіцця сітуацыі.

Чатыры з сямі краін Еўразіі таксама паведамілі пра пагаршэнне прававога асяродку ў 2017 годзе. Беларусь, Расія і Азербайджан, тры краіны з самымі неспрыяльнымі прававымі варункамі ва ўсёй Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, у 2017 годзе адзначылі далейшае ўскладненне сітуацыі. У Беларусі АГС і актывісты, якія пратэставалі на пачатку года супраць падатку, што спаганяецца з непрацоўных, зазналі затрыманні і пераслед. У Азербайджане заканадаўчыя змены, якія ўвайшлі ў сілу ў 2017 годзе, усталявалі ліміты і падаткі на аперацыі АГС з наяўнымі грашыма, што ўскладніла іх

фінансавую дзейнасць. Іншыя прававыя змены абмежавалі доступ АГС да юрыдычных паслугаў у краіне.

У Расіі быў прыняты закон, які дазваляе Міністэрству юстыцыі абвяшчаць прадстаўніцтва замежных сродкаў масавай інфармацыі замежнымі агентамі; спіс непажаданых замежных арганізацый быў пашыраны, а на тых, хто нібыта меў кантакты з такімі арганізацыямі, былі накладзеныя штрафы. На супрацьлеглым баку спектру – Украіна, якая ганарылася тым, што яе адзнака прававога асяродку для АГС набліжалася да паказчыкаў краін Паўночнай групы, таксама адзначыла пагаршэнне сітуацыі з-за ўвядзення патрабавання да актывістаў па барацьбе з карупцыяй дэклараваць свае прыбыткі. А спробы ўрада ўвесці ў 2017 годзе жорсткія ўмовы фінансавай справаздачнасці грамадскіх аб'яднанняў і некалькі выпадкаў пераследу АГС з боку ўладаў дадалі ў прававы асяродак яшчэ больш нявызначанасці.

У Малдове таксама была зробленая небяспечная спроба абмежаваць грамадзянскую прастору, хаця на выніку яна поспеху не мела, і сітуацыя была збалансаваная шэрагам пазітыўных зменаў. Міністэрства юстыцыі паспрабавала ўвесці новыя заканадаўчыя палажэнні, якія б выключылі АГС, якія маюць замежнае фінансаванне, з працэсу прыняцця рашэнняў і наклалі б на іх дадатковыя патрабаванні да справаздачнасці. Аднак пасля таго, як больш за 80 АГС публічна выказалі сваю незадаволенасць, адпаведны законапраект быў адкліканы і паўторна цягам года не разглядаўся.

## ПАШЫРЭННЕ ПАКЛЁПНІЦКІХ КАМПАНІЙ

Пагаршэнне прававога асяродку часта суправаджалася негатыўнай рыторыкай урадавых і праўрадавых СМІ ў дачыненні да АГС, асабліва тых, якія выступаюць з крытыкай уладаў. У адрозненне ад адзінкавых матэрыялаў, якія крытыкуюць дзейнасць асобных АГС, былі разгорнутыя кампаніі, якія наўмысна спрабавалі дыскрэдытаваць і дэлегітымізаваць пэўныя арганізацыі або цэлыя сегменты сектара. Спробы зняславіць арганізацыі, якія атрымліваюць замежнае фінансаванне, малюючы іх як пагрозу нацыянальнай бяспекі, з'яўляюцца ўсё больш пашыранай адзнакай такіх кампаній.

Дзесяць краін у дадзеным Індэксе паведамілі пра тое, што ў 2017 годзе ў выніку такіх нападак пагоршыўся грамадскі імідж АГС. Гэта асабліва характэрна для Паўночнай групы, дзе ўздымаюць гэтую праблему шэсць з васьмі краін – Чэхія, Венгрыя, Латвія, Польшча, Славакія і Эстонія. Вельмі сур'ёзная сітуацыя склалася ў Венгрыі, дзе прапаганда, арганізаваная ўрадам супраць АГС, адзначаная як ключавая прыкмета публічнай інфармацыі ў 2017 годзе. Абвінавачванні АГС у падрыве суверэнітэту краіны штодня гучалі ў парламенце, на прэс-канферэнцыях і ў афіцыйных урадавых і партыйных заявах. АГС мелі мала магчымасцяў зняпраўдзіць такія паведамленні, паколькі большасць сродкаў масавай інфармацыі кантралюецца ўрадам ці праўрадавымі арганізацыямі. Падобныя нападкі на АГС адбываліся ў Польшчы і Славакіі. У Латвіі АГС таксама падпалі пад крытыку з боку палітыкаў і дзяржаўных чыноўнікаў. Новы прэм'ер-міністар Чэшскай Рэспублікі і сябры парламента ў Эстоніі паставілі пытанне аб скарачэнні аб'ёмаў дзяржаўнага фінансавання АГС. Гэтыя выступы негатыўна адбіліся на грамадскім іміджы АГС і ўзроўні даверу да сектара. Паводле чэшскага Цэнтра даследаванняў грамадскай думкі (Center for Public Opinion Research), сёння АГС давяраюць крыху больш за трацiну рэспандэнтаў, што на 10% менш, чым у апошнія тры гады. Між тым, адсотак рэспандэнтаў, якія не давяраюць АГС, за той жа перыяд часу павялічыўся з 35% да 55%.

У краінах дзвюх іншых груп, у тым ліку ў Балгарыі, Македоніі, Румыніі і Малдове, таксама назіраецца пагаршэнне грамадскага іміджу. Ва ўсіх гэтых краінах АГС абвінавачваліся ў тым, што служаць замежным інтарэсам. У Македоніі маштабная паклёпніцкая кампанія сур'ёзна паўплывала на рэпутацыю грамадзянскай супольнасці. Паводле Македонскага цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва (MCIC), давер да АГС зменшыўся з 50,5% у 2015 годзе да 43% у 2017 годзе.

Бізнесмен і філантроп Джордж Сорас і ягоныя фонды становяцца ўсё больш частай мэтай у кампаніях супраць АГС. У справаздачах Балгарыі, Венгрыі, Македоніі, Польшчы, Румыніі і Славакіі адзначаецца, што ва ўсіх гэтых краінах прайшлі паклёпніцкія кампаніі, скіраваныя адмыслова на дыскрэдытацыю ролі фінансавання ад Сораса. Напрыклад,

у Македоніі ў першай палове 2017 года была арганізаваная кампанія «дэ-Сорасізацыі», каб паказаць АГС у якасці злачынцаў і здраднікаў і сур'ёзна паслабіць працу, рэсурсную падтрымку і рэпутацыю грамадзянскай супольнасці. Урадавая прапаганда ў Венгрыі абвясціла Сораса і ягоную «сетку» «ворагамі», маючы на ўвазе меркаваны план Сораса даць доступ мільёнам мігрантаў у Еўропу, тым самым пагражаючы цэласнасці нацыі. Аналагічна ў цэнтральных навінах у Румыніі часта гучалі абвінавачванні ў тым, што некаторыя арганізацыі, а таксама асобныя лідэры АГС, атрымлівалі фінансаванне ад Сораса на тое, каб падштурхоўваць людзей да пратэстаў, заахвочваць уцекачоў ехаць у Румынію і падрываць рэпутацыю Румыніі на міжнародным узроўні.

Шэраг іншых краін таксама адзначылі арганізаваныя нападкі на АГС, хаця гэта не сталася прычынай пагаршэння іх грамадскага іміджу. У Арменіі ў 2017 годзе выйшаў шэраг негатыўных публікацый, найперш у праўрадавых сродках масавай інфармацыі, у якіх АГС абвінавачваліся ў тым, што выконваюць замову донараў і ідуць насуперак традыцыйным армянскім каштоўнасцям. У Расіі негатыўная прапаганда была менш прыкметная, чым у 2016 годзе, але і яна паўплывала на стаўленне да замежнага фінансавання АГС. Паводле даследаванняў Левада-Цэнтра, 40% апытаных заявілі, што гранты еўрапейскіх дабрачынных фондаў з'яўляюцца «хутчэй непрымальнай» крыніцай фінансавання расійскіх АГС. У Сербіі СМІ, блізкія да ўрада, працягвалі дыскрэдытаваць АГС, якія займаюцца барацьбой з карупцыяй, прасоўваюць прынцыпы справаздачнасці ўрада і вяршэнства закона. СМІ публікавалі бюджэты АГС і называлі іх замежнымі наймітамі. У Грузіі справаздача Фонду развіцця СМІ (Media Development Foundation) па выніках маніторынгу антызаходняй прапаганды за 2017 год адзначае, што негатыўныя каментары ў дачыненні да АГС павялічыліся ўтрая. У Азербайджане СМІ, якія ў значнай ступені знаходзяцца пад кантролем урада, часта называюць агентамі Захаду тыя АГС, якія працуюць у галіне правоў чалавека, дэмакратыі, вяршэнства права, гендарнай роўнасці, правоў дзяцей, правасуддзя ў дачыненні да непаўнагадовых, выбараў, правоў сродкаў масавай інфармацыі, падтрымкі грамадзянскай супольнасці, празрыстасці і правоў уласнасці.

## УМАЦАВАННЕ ІНФРАСТРУКТУРЫ СЕКТАРА

Параметр «інфраструктура сектара» аналізуе даступнасць, якасць і ўстойлівасць розных установаў і службаў, якія падтрымліваюць сектар АГС і ўключаюць пасярэдніцкія арганізацыі падтрымкі (ПАП) і рэсурсныя цэнтры, мясцовыя грантавыя арганізацыі, кааліцыі і сеткі, магчымасці навучання і міжсектарныя партнёрствы. У 2017 годзе больш за траціну краін, уключаных у дадзены Індэкс, зафіксавалі ўзмацненне інфраструктуры, якая падтрымлівае сектар.

У Паўночнай групе сітуацыя паляпшылася ў Літве і Славеніі. У Літве пасярэдніцкія арганізацыі падтрымкі, асабліва парасонавыя структуры, пашырылі ў 2017 годзе свае паслугі для АГС у сферах распаўсюду інфармацыі, арганізацыі трэнінгаў і забеспячэння магчымасцяў для сябраў прадаваць свае паслугі. У Славеніі кааліцыі працягвалі паляпшаць абмен інфармацыяй і супольнае прасоўванне інтарэсаў сектара. Умацаваліся таксама партнёрскія стасункі паміж АГС і іншымі сектарамі.

Чатыры краіны Паўднёвай групы – Албанія, Боснія, Македонія і Чарнагорыя – таксама паведамілі пра ўмацаванне інфраструктуры ў 2017 годзе. Усе яны адзначылі, што супрацоўніцтва ў сектары палепшылася. Асабліва трэба адзначыць ролю, якую ў Босніі і Герцагавіне адыграла кааліцыя «Грамадзянскі дыялог», якая складалася больш чым з 120 арганізацый-сябраў і працавала разам з Міністэрствам юстыцыі над завяршэннем Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Радай міністраў і АГС. Гэта сталася адным з самых значных дасягненняў грамадзянскай супольнасці за апошнія пяць год. У Македоніі таксама ўмацаваліся партнёрскія стасункі з іншымі сектарамі. Да таго ж, больш міжнародных донарскіх сродкаў былі выдаткаваныя і размеркаваныя ў выглядзе грантаў у Албаніі, а ў Чарнагорыі былі створаныя новыя рэсурсныя цэнтры.

У Еўразіі ўзмоцнены патэнцыял пасярэдніцкіх арганізацый падтрымкі таксама адыграў ключавую ролю ў паляпшэнні інфраструктуры ў Арменіі, Расіі і Украіне. Ва Украіне павялічылася колькасць ПАП і рэсурсных цэнтраў АГС; у Арменіі ПАП і рэсурсныя цэнтры аказвалі паслугі для значнай колькасці АГС па ўсёй краіне і ўсё

больш прызнавалі неабходнасць і важнасць арганізацыйнага развіцця АГС; у Расіі ўрад аднавіў фінансаванне такіх арганізацый.

Нягледзячы на адзначаныя паляпшэнні ў 2017 годзе, інфраструктура сектара ў большай частцы рэгіёну па-ранейшаму застаецца няўстойлівай, часткова з той прычыны, што яна шмат у чым залежыць ад фінансавання замежных донараў. Калі фінансаванне донараў сканчаецца, падтрымка АГС можа змяншацца ці спыняцца ўвогуле. Характэрна, што напрыканцы 2017 года скончылася праграма тэхнічнай дапамогі ЕЗ для АГС (TACSO), якая цягам апошніх некалькіх год аказвала розныя паслугі па ўмацаванні патэнцыялу АГС у Албаніі, Босніі, Косава, Македоніі, Сербіі і Чарнагорыі. Аднак інфраструктура сектара ў шэрагу краін атрымлівае ўсё большую фінансавую падтрымку з унутраных крыніцаў, асабліва ад урадаў, і найперш у тых краінах, якія з'яўляюцца сябрамі ЕЗ.

У шэрагу краін дзяржаўнае фінансаванне ўжо даўно стала важнай крыніцай фінансавання інфраструктуры сектара. Мясцовыя арганізацыі-грантадаўцы, такія як Нацыянальны фонд грамадзянскай супольнасці (National Foundation for Civil Society) у Эстоніі, Нацыянальны фонд развіцця грамадзянскай супольнасці (National Foundation for Civil Society Development) у Харватыі і Нацыянальны фонд АГС (National NGO Fund) у Латвіі, традыцыйна абапіраюцца на дзяржаўнае фінансаванне для размеркавання грантаў сярод мясцовых АГС. У Літве Міністэрства культуры працягвае фінансаваць пяць рэгіянальных цэнтраў падтрымкі АГС, якія арганізуюць і падтрымліваюць дзейнасць па ўмацаванні патэнцыялу мясцовых арганізацый і ажыццяўляюць рэгіянальныя праграмы рэ-грантынгу для рэалізацыі ініцыятываў грамадзянскай супольнасці, міжкультурнага дыялогу і мерапрыемстваў меншасцяў. У Венгрыі ўрад падтрымлівае сетку грамадскіх інфармацыйных цэнтраў. У Расіі замежнае фінансаванне, якое раней з'яўлялася важнай крыніцай падтрымкі інфраструктурных арганізацый, сёння мае мінімальны памер праз закон «аб замежных агентах», таму такія арганізацыі ў значнай ступені падтрымліваюцца мясцовымі і федэральнымі ўрадамі. Паводле справаздачы Грамадскай палаты за 2017 год, агулам 234 рэсурсныя цэнтры атрымалі ў 2016 годзе падтрымку з рэгіянальных і

муніцыпальных бюджэтаў у 31 рэгіёне. Фонд грантаў Прэзідэнта таксама служыць важнай крыніцай фінансавання мясцовых АГС, у тым ліку інфраструктурных арганізацый і сетак.

У 2017 годзе былі таксама распачатыя некаторыя новыя праграмы з унутраным фінансаваннем. Напрыклад, у Чэшскай Рэспубліцы Офіс Урада адкрыў новую грантавую праграму для падтрымкі міжведамасных сетак, якія дзейнічаюць на нацыянальным узроўні. У Літве ўрад прыняў План дзеянняў па ўмацаванні няўрадавых арганізацый і мясцовых супольнасцяў, вылучыўшы 900 тысяч еўра на развіццё нацыянальных парасонавых арганізацый.

У Малдове Міністэрства моладзі і спорту распачало Праграму развіцця моладзевых цэнтраў 2017-2022 гг., а таксама праграму раённых і муніцыпальных грантаў для фінансавання моладзевых ініцыятываў і праектаў.

У рэгіёне запускаюцца разнастайныя інавацыйныя прылады, каб дапамагчы АГС працаваць больш эфектыўна. У Сербіі Catalyst Balkans цягам года распрацавала тры новыя і палепшыла дзейныя онлайн-інструменты для арганізацыйнага развіцця: Giving Balkans – платформу, якая дае інфармацыю і візуальныя справаздачы пра дабрачыннасць на Заходніх Балканах; CiviCatalyst – першую ў Сербіі платформу кіравання стасункамі з кліентамі (Client Relations Management system), адаптаваную для АГС; і Donations – краўдфандынгавую платформу для правядзення некамерцыйных кампаній.

Расія стала лідэрам у гэтай сферы, бо выкарыстоўвала мноства інавацыйных платформаў, якія падтрымліваюць развіццё сектара. Праграма «Акселератар Благасферы» дапамагае АГС распрацоўваць праектныя ідэі, а таксама развіваць навыкі кіравання і камунікацыі пры дапамозе ментараў з грамадскага і бізнес сектараў. Медыяцэнтр прапануе АГС магчымасць сустрэцца са спецыялістамі ў галіне сродкаў масавай інфармацыі і атрымаць дапамогу ў арганізацыі медыйных мерапрыемстваў. Навігатар дзяржаўных паслугаў для АГС дапамагае арганізацыям у ажыццяўленні розных стасункаў з органамі ўлады, у тым ліку ў рэгістрацыі, падатковых плацяжах, атрыманні афіцыйнай

інфармацыі і праходжанні праверак. Плагін «Онлайн-Лейка» дазваляе арганізацыям адсочваць онлайн-ахвяраванні. Прыватны сектар таксама паказвае большую цікавасць да падтрымкі АГС. Праект ProCharity, распачаты Дабрачынным фондам «Сябры» у 2017 годзе пры падтрымцы MasterCard, дапамагае АГС знайсці спецыялістаў з камерцыйнага сектара, якія гатовыя бясплатна дзяліцца прафесійнымі навыкамі. Праект «Інфраструктура дабрачыннасці» (PHILIN), які падтрымлівае філантроп і прадпрымальнік Рубэн Варданян, прапануе АГС інструмент для выяўлення і ацэнкі арганізацыйных рызык у сістэме адміністравання і бухгалтэрыі.

## ТЭНДЭНЦЫІ Ў ФАРМАВАННІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

Агульны ўзровень устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі зноў прадэманстраваў у 2017 годзе разыходжанне ў тэндэнцыях. У пяці краінах – Азербайджане, Венгрыі, Латвіі, Польшчы і Румыніі, – сярод якіх чатыры сталыя сябры ЕЗ, адзначылі агульнае зніжэнне ўстойлівасці, у той час як шэсць краін – Албанія, Арменія, Малдова, Расія, Славенія і Украіна, - у тым ліку чатыры з Еўразіі, – дэкларуюць умацаванне ўстойлівасці сектара.

### ПАЎНОЧНАЯ ГРУПА

Краіны Паўночнай групы (краіны Балтыі і Вышаградскай групы) па-ранейшаму маюць самы высокі ўзровень устойлівасці АГС у Еўропе і Еўразіі, нягледзячы на тое, што тры краіны – Венгрыя, Латвія і Польшча – кажуць пра пагаршэнне сітуацыі ў 2017 годзе. Агульная ўстойлівасць у Венгрыі і Польшчы зноў пагоршылася ў 2017 годзе ў выніку спробаў правых, папулісцкіх урадаў звузіць грамадзянскую прастору.

Агульны ўзровень устойлівасці найбольш драматычна змяніўся ў Венгрыі, адзінай краіне, дзе зафіксавана змена бала больш чым на 0,1. У 2017 годзе ўстойлівасць АГС Венгрыі знізілася на 0,2 бала і працягнула рухацца ўніз па траекторыі, якая падае з 2012 года. Пагаршэнне было адзначанае па ўсіх параметрах устойлівасці, асабліва заўважнае ў прававым асяродку і грамадскім іміджы, пра што адзначалася вышэй. І

хаця пагаршэнне прававой, палітычнай і фінансавай сітуацыі стварыла сур'ёзныя перашкоды для сектара АГС, яно адначасова прывяло да «абуджэння» грамадзянскай супольнасці: АГС актывізавалі свае намаганні па самаабароне, паляпшэнню працы з сябрамі і прыхільнікамі і ўзмацненню публічнай камунікацыі.

Аналагічныя тэндэнцыі назіраліся ў Польшчы, дзе агульны ўзровень устойлівасці зніжаецца другі год запар. Негатыўныя змены былі адзначаныя ў пяці з сямі параметраў устойлівасці, і найбольшае зніжэнне балаў адзначана ў прававым асяродку і грамадскім іміджы.

Сітуацыя ў Латвіі менш драматычная, але ўсё яшчэ выклікае занепакой. Пагаршэнне адзначанае ў чатырох параметрах устойлівасці – прававым асяродку, арганізацыйным патэнцыяле, фінансавай устойлівасці і грамадскім іміджы. Прававы асяродак пагоршыўся з прычыны ўнясення зменаў у падатковую сістэму, якая будзе мець негатыўны ўплыў на фінансавую ўстойлівасць сектара АГС у доўгатэрміновай перспектыве. Паслабленая фінансавая ўстойлівасць АГС паўплывала на стан арганізацыйнага патэнцыялу, у той час як грамадскі імідж сектара пацярпеў ад паклёпніцкай рыторыкі палітыкаў і чыноўнікаў.



Славенія – адзіная краіна Паўночнай групы, дзе цягам года агульны ўзровень устойлівасці АГС палепшыўся дзякуючы дасягненням у чатырох з сямі параметраў устойлівасці – прававым асяродку, фінансавай устойлівасці, адвакатаванні і інфраструктуры сектара. Хаця асноўныя законы, якія рэгулююць рэгістрацыю і дзейнасць АГС, не змяняліся, цягам года было прынята некалькі заканадаўчых паправак, якія палепшылі прававы асяродак для АГС. Павялічыліся таксама агульныя прыбыткі АГС і аб'ём дзяржаўнага фінансавання сектара. Акрамя таго, палепшыліся некаторыя працэдуры дзяржаўнага фінансавання праграм АГС на нацыянальным і мясцовым узроўнях. Цягам года АГС актыўна ўдзельнічалі ў працэсе прыняцця рашэнняў і здзейснілі некалькі паспяховых шырокамаштабных адвакатыўных кампаній, а пасярэдніцкія арганізацыі падтрымкі павялічылі колькасць трэнінгаў і іншыя паслугі для мясцовых АГС і тым самым умацавалі інфраструктуру, які падтрымлівае сектар.

## ПАЎДНЁВАЯ ГРУПА

У сярэднім агульная ўстойлівасць у Паўднёвай групе краін (паўднёва-ўсходняя Еўропа) працягвае падаць, застаючыся дзесьці пасярэдзіне паміж Паўночнай групай і Еўразіяй. Усе дзевяць краін фіксуюць агульны ўзровень у дыяпазоне стадыі «Устойлівасць нестабільная» паміж 3,3 (Балгарыя і Харватыя) і 4,1 (Сербія). Узровень устойлівасці АГС у краінах Паўднёвай групы з 2016 года збольшага не змяніўся: толькі адна краіна – Албанія – адзначыла ў 2017 годзе паляпшэнне сітуацыі і адна краіна – Румынія – пагаршэнне.

У Албаніі агульная ўстойлівасць палепшылася, да чаго прывялі дасягненні ў сферы аказання паслугаў і інфраструктуры сектара. За апошнія некалькі год колькасць АГС, якія аказваюць паслугі насельніцтву, павялічылася, і дзяржава ўсё часцей прызнае ролю грамадзянскай супольнасці ў аказанні паслугаў, асабліва сацыяльных. Інфраструктура сектара палепшылася, паколькі ў краіне было пераразмеркавана больш міжнародных донарскіх сродкаў і актывізавалася супрацоўніцтва ў сектары АГС.

У Румыніі на зніжэнне ўстойлівасці сектара ўплывалі тыя ж фактары, што і ў Паўночнай групе, пры гэтым пагаршэнне адзначаецца амаль па ўсіх параметрах устойлівасці. Грамадскі давер да грамадзянскай супольнасці, а таксама стасункі паміж АГС і дзяржаўнымі органамі ў 2017 годзе пагоршыліся з прычыны негатыўнага стаўлення ўрада да сектара. Эфектыўнасць адвакатавання ўпала за кошт усё больш пустых і безвыніковых грамадскіх кансультацый з дзяржаўнымі службовымі асобамі. Напрыканцы года чакаліся заканадаўчыя змены, якія маглі сур'ёзна скараціць дзейнасць АГС, чым адбілі жаданне рэгістраваць новыя АГС. Акрамя таго, новая падатковая палітыка абмежавала доступ АГС да сродкаў і паглыбіла іх фінансавыя праблемы.

Хаця фінансавая ўстойлівасць па-ранейшаму з'яўляецца самым слабым параметрам устойлівасці для кожнай краіны Паўднёвай групы, амаль палова з іх паведаміла пра паляпшэнне фінансавай устойлівасці ў 2017 годзе – светлая пляма ў традыцыйна гнятлівым параметры.

Прычыны такога паляпшэння розныя і звязаныя з ростам дзяржаўнага, міжнароднага фінансавання і мясцовых ахвяраванняў. Напрыклад, у Харватыі большая палітычная стабільнасць дазволіла ўраду абвесціць больш тэндэраў на атрыманне мясцовага, нацыянальнага і еўрапейскага фінансавання. Акрамя таго, пасля значнага скарачэння ў 2016 годзе быў часткова адноўлены бюджэт Нацыянальнага фонду развіцця грамадзянскай супольнасці (National Foundation for Civil Society Development) – важнай крыніцы грантаў для грамадзянскай супольнасці Харватыі, што палепшыла фінансавае становішча шматлікіх АГС. У Косава былі распачатыя новыя міжнародныя праграмы фінансавання. Усё большая колькасць АГС сведчыць аб наяўнасці ў іх надзейных сістэм і працэдур кіравання фінансамі. У Македоніі расце мясцовая дабрачыннасць. Паводле Сусветнага індэкса дабрачыннасці 2017 года (CAF World Giving Index), Македонія ўваходзіць у лік трынаццаці краін, якія зрабілі прарыў з пункту гледжання дабрачыннасці, паколькі ў 2017 годзе ўзнялася са 119 у 2016 годзе на 69 месца. У Чарнагорыі нядаўна прынятыя папраўкі да Закону аб АГС увялі новы механізм дзяржаўнага фінансавання АГС, які будзе рэалізаваны ў 2018 годзе. Гэтыя папраўкі прадугледжваюць, што

0,3% бягучага бюджэту краіны павінны быць выдаткаваныя на дзейнасць АГС у інтарэсах грамадства, 0,1% – на суфінансаванне праграм і праектаў, што фінансуюцца ЕЗ, і яшчэ 0,1% – на падтрымку АГС, якія працуюць з людзьмі з інваліднасцю. Калі задума будзе здзейсненая паслядоўна і цалкам, Закон прывядзе да значнага павелічэння аб'ёмаў дзяржаўнага фінансавання АГС.




## ЕЎРАЗІЯ

Сярэднія паказчыкі ўстойлівасці АГС у Еўразіі па-ранейшаму ніжэйшыя, чым у Паўночнай і Паўднёвай групах. Устойлівасць АГС ва Украіне працягвае заставацца самай высокай сярод краін Еўразіі, тады як Беларусь і Азербайджан паказваюць самы нізкі ўзровень устойлівасці сярод усіх краін Індэкса ўстойлівасці АГС. У 2017 годзе ў Азербайджане зафіксаванае далейшае зніжэнне ўстойлівасці АГС, а чатыры краіны – Арменія, Малдова, Расія і Украіна – зафіксавалі рост.

Устойлівасць АГС у Азербайджане ў 2017 годзе пагоршылася яшчэ больш. Негатыўныя тэндэнцыі вызначаныя ў пяці параметрах устойлівасці. АГС, асабліва тыя, якія крытыкуюць урад, пераследаваліся і сутыкаліся з праблемамі пры рэгістрацыі. У гэты ж час увайшлі ў сілу

заканадаўчыя змены, якія зацвердзілі ліміты і падаткі на аперацыі з наяўнымі сродкамі, ускладнілі фінансавыя аперацыі АГС і абмежавалі доступ АГС да юрыдычных паслугаў. Няспынны ціск на сектар АГС негатыўна паўплываў на арганізацыйны патэнцыял, фінансавую ўстойлівасць, аказанне паслугаў і інфраструктуру сектара. АГС практычна не маюць доступ да замежнага фінансавання, што яшчэ паслабіла арганізацыйны патэнцыял АГС, знізіла іх здольнасць аказваць паслугі і разбурыла інфраструктуру, якая падтрымлівала сектар.

У адрозненне ад свайго суседа, Арменія зафіксавала паляпшэнне па пяці параметрах устойлівасці ў 2017 годзе. Увайшоў у сілу новы Закон «Аб грамадскіх арганізацыях» і іншыя заканадаўчыя папраўкі, што забяспечыла больш спрыяльную нарматыўную базу для АГС. Арганізацыі ўсё часцей прызнаюць патрэбы ў сваём інстытуцыянальным развіцці. Шмат якія АГС палепшылі свой унутраны менеджмент і стратэгічнае планаванне. Пазітыўныя тэндэнцыі адзначаюцца ў фінансавай устойлівасці, адвакатаванні і інфраструктуры сектара за кошт пашырэння дыверсіфікацыі фінансавання, развіцця дыялогавых платформаў і новых магчымасцяў навучання.

У Малдове АГС палепшылі сувязі са сваімі мэтавымі групамі і прыхільнікамі і цягам года ўсё больш умацоўвалі сістэмы ўнутранага кіравання. Нягледзячы на тое, што АГС па-ранейшаму моцна залежаць ад фінансавання замежных донараў, у 2017 годзе былі распрацаваныя і ўкаранёныя новыя крыніцы прыбытку для АГС, у першую чаргу, 2%-ы механізм, які дазваляе фізічным асобам накіроўваць 2% свайго падаходнага падатку ў АГС. Узрасла мясцовая дабрачыннасць. Адвакатаванне АГС таксама палепшылася.

Устойлівасць АГС працягвала ўмацоўвацца ва Украіне, пры гэтым прагрэс быў адзначаны як у арганізацыйным патэнцыяле, так і ў інфраструктуры сектара. У той жа час, цягам года пагоршыўся прававы асяродак, які рэгулюе сектар.

Расія, дзе цягам апошніх чатырох год устойлівасць рэзка пагаршалася, у 2017 годзе змяніла курс і прадэманстравала сціплыя паляпшэнні ў арганізацыйным патэнцыяле, фінансавай устойлівасці,

інфраструктуры сектара і грамадскім іміджы. Фінансавая ўстойлівасць палепшылася дзякуючы павелічэнню аб'ёму і якасці дзяржаўнага фінансавання, росту краўдфандынгавых платформаў і прыватных ахвяраванняў. Рост фінансавай устойлівасці разам з развіццём інфармацыйных і тэхналагічных рэсурсаў, якія падтрымліваюць некамерцыйны сектар, дапамог умацаваць арганізацыйны патэнцыял сектара. Інфраструктура ўзмацнялася дзякуючы аднаўленню ўрадам фінансавання інфраструктурных арганізацый; расце цікавасць да развіцця інфраструктуры і з боку бізнесу і прыватных фондаў. У адрозненне ад гэтых паляпшэнняў, прававы асяродак, які рэзка пагаршаўся апошнія пяць год, стаў яшчэ больш неспрыяльным у сувязі тым, што дзяржава зрабіла дадатковыя крокі для абмежавання кантактаў АГС з замежнымі арганізацыямі, як адзначалася вышэй.




У адрозненне ад негатыўных тэндэнцый у прававым асяродку, у Еўразіі назіраліся пазітыўныя зрухі ў сферы развіцця арганізацыйнага патэнцыялу і адвакатавання. Як адзначалася вышэй, чатыры краіны, дзе ўстойлівасць АГС у цэлым палепшылася, паказваюць поспехі ва ўмацаванні арганізацыйнага патэнцыялу, у тым ліку ў распрацоўцы місій і стратэгічных планаў, унутраных сістэмах кіравання, працы з мэтавымі групамі і прыхільнікамі, кадравым забеспячэнні і тэхнічным патэнцыяле. Аднак ва ўсіх краінах арганізацыйны патэнцыял АГС шырока вар'іруецца.

Чатыры краіны – Арменія, Беларусь, Грузія і Малдова – таксама паведамілі пра паляпшэнне адвакатавання ў 2017 годзе. У Арменіі адвакатаванне ўзмацнілася дзякуючы ўкараненню і больш інтэнсіўнаму выкарыстанню інстытуцыйных платформаў і магчымасцяў удзелу, у тым ліку інтэрактыўнай онлайн платформы e-draft.am, на якой сабраныя законапраекты, распрацаваныя дзяржаўнымі органамі. Грузінскія і малдоўскія АГС цягам года былі ўцягнутыя, а часта самі ініцыявалі нацыянальныя дыскусіі па найбольш важных пытаннях у сваіх краінах. Магчымасці адвакатавання ў Беларусі застаюцца вельмі абмежаванымі, аднак АГС і актывісты вышлі на вуліцы пратэставаць супраць падатку на «дармаедства». Таксама шырока выкарыстоўваліся петыцыйныя інтэрнэт-платформы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Сёлетні Індэкс зноў сведчыць пра тое, што складаная праца па развіцці ўстойлівай дэмакратычнай культуры, у тым ліку незалежнай, дынамічнай і плюралістычнай грамадзянскай супольнасці, ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, яшчэ далёкая ад завяршэння. Прастора для дзейнасці грамадзянскай супольнасці застаецца абмежаванай у такіх краінах рэгіёну, як Азербайджан, Беларусь і Расія, і ў апошнія некалькі год значна скарацілася ў краінах, якія раней дэманстравалі прагрэс, – Венгрыі, Польшчы і Румыніі. АГС і іх прыхільнікі павінны працягваць змагацца з неспрыяльнымі праваавымі абмежаваннямі ў сектары і супрацьстаяць негатыўнай інфармацыі пра сваё прызначэнне. Узмацненне інфраструктуры, якая падтрымлівае сектар АГС, можа адыграць у гэтым працэсе ключавую ролю.

Краінавыя справаздачы змяшчаюць падрабязны аналіз сектараў АГС у 24 краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Мы спадзяемся, што агляд за 2017 год выяўляе важныя тэндэнцыі і будзе карысны для АГС, уладаў, донараў і даследчыкаў, зацікаўленых у развіцці сектара арганізацый грамадзянскай супольнасці.

# УСТОЙЛІВАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ – 2017

## 2017 УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.5 (2016: 5.5)




Пасля трох гадоў паступовага росту агульная ўстойлівасць беларускіх арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС) у 2017 годзе засталася на ўзроўні 2016 года: сітуацыя пагоршылася па двух параметрах – прававым асяродку і фінансавай устойлівасці, і палепшылася па трох – адвакатаванні, аказанні паслугаў і грамадскім іміджы.

Прававы асяродак для дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Беларусі стаў яшчэ менш спрыяльным, бо дзяржава затрымлівала і пераследавала АГС і актывістаў, якія ўдзельнічалі ў масавых пратэстах. У лютым-сакавіку 2017 года па ўсёй краіне прайшлі буйныя выступы супраць Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрымanства». Дэкрэт №3, вядомы як «дэкрэт аб дармаедстве», абавязваў працаздольных жыхароў Беларусі, якія не ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржаўных выдаткаў ці ўдзельнічалі менш 183

каляндарных дзён, пад пагрозай пакарання сплаціць адмыслова ўведзены падатак. Дадзены захад супярэчыў артыкулу 41 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынцыпам міжнароднага права ў галіне правоў чалавека.

У 2017 годзе прававое рэгуляванне дзейнасці АГС на заканадаўчым узроўні не мела значных зменаў, аднак падатковы рэжым для грамадскіх арганізацый пагоршыўся. Дзяржава пачала спаганяць падатак з АГС на прыбытак са сродкаў замежнай бязвыплатнай дапамогі і абавязала некаторых атрымальнікаў бясплатных паслугаў АГС сплочваць падаходны падатак на кошт гэтых паслугаў.

Стан фінансавай устойлівасці незалежных АГС, які працяглы час застаецца слабым, цягам года пагоршыўся яшчэ больш у сувязі са скарачэннем фінансавання з боку міжнародных донараў і па-ранейшаму абмежаваным доступам АГС да мясцовых рэсурсаў.

Нягледзячы на неспрыяльныя вонкавыя ўмовы, 2017 год быў адзначаны шэрагам поспехаў беларускіх АГС. Магчымасці для адвакатавання ў краіне абмежаваныя, аднак АГС актыўна абаранялі інтарэсы сваіх мэтавых груп і здолелі паўплываць на заканатворчы працэс. Насуперак мэтанакіраванаму пераследу арганізацый і актывістаў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах, у стасунках паміж дзяржаўнымі чыноўнікамі і АГС назіралася невялікае пацяпленне. Аднак у цэлым узаемадзеянне паміж сектарам і дзяржавай застаецца вельмі стрыманым.

За кошт больш актыўнага выкарыстання інфармацыйных тэхналогій АГС палепшылі якасць аказання сваіх паслугаў. Праз гэта АГС здолелі ў большай ступені адпавядаць патрэбам не толькі сваіх сяброў і прыхільнікаў, але і іншых мэтавых груп.

Палепшыўся і грамадскі імідж АГС. Арганізацыі сталі больш актыўнымі ў прасоўванні сваіх ініцыятываў, асабліва ў сацыяльных сетках, а СМІ цягам года надавалі больш увагі пытанням грамадзянскай актыўнасці. Вынікі нацыянальных апытанняў паказалі, што беларусы ўспрымаюць АГС і актывістаў у цэлым станоўча ці нейтральна і што грамадскі давер да сектара ў пэўнай ступені павялічыўся.

АГС засяродзіліся на ўмацаванні свайго арганізацыйнага патэнцыялу і надалі асаблівую ўвагу прыцягненню сродкаў з мясцовых крыніцаў. У 2017 годзе АГС і актывісты здолелі сабраць на краўдфандынгавых платформах суму, эквівалентную болей за 600 тысяч долараў ЗША, - удвая больш, чым у 2016 годзе.

Паводле звестак на 1 студзеня 2018 года, у Беларусі налічваліся 2856 зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў, з іх 223 міжнародныя, 762 рэспубліканскія і 1871 мясцовае. Зарэгістраваныя таксама 29 прафесійных саюзаў, 39 саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, 195 фондаў і 7 рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў. У 2017 годзе ў краіне зарэгістраваныя 172 новыя АГС, у тым ліку 150 новых грамадскіх аб'яднанняў (6 міжнародных, 27 рэспубліканскіх і 117 мясцовых) і 22 фонды. Пры гэтым грамадскія аб'яднанні і фонды па-ранейшаму сутыкаюцца з праблемамі пры рэгістрацыі; больш дзесяці АГС у 2017 годзе атрымалі адмову ў рэгістрацыі. Частка арганізацый рэгіструецца ў мясцовых выканаўчых камітэтах як некамерцыйныя ўстановы, але афіцыйныя звесткі пра іх колькасць сістэматызаваць даволі складана. Праз неспрыяльны для АГС прававы асяродак некаторыя арганізацыі працягваюць рэгістравацца за мяжой ці дзейнічаць у краіне без рэгістрацыі. Каля 200 беларускіх АГС зарэгістраваныя ў Літве, Польшчы, Чэхіі і іншых краінах.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.8 (2016: 6.7)




Беларускія АГС працягваюць дзейнічаць у неспрыяльных прававых варунках: за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый пагражае крымінальная адказнасць, працэдура рэгістрацыі складаная, а доступ АГС да мясцовага і замежнага фінансавання абмежаваны.

Прававая практыка ў дачыненні да АГС у 2017 годзе пагоршылася. На пачатку года прайшла хваля затрыманняў,ператрусаў, канфіскацыі абсталявання АГС і актывістаў, якія мелі дачыненне да арганізацыі пратэстаў супраць падатку на дармаедства. Акрамя таго, пагоршыўся рэжым падаткаабкладання саміх АГС.

Працэс рэгістрацыі застаецца для многіх АГС праблематычным. У 2017 годзе органы юстыцыі адмовілі ў рэгістрацыі больш 10 грамадскім аб'яднанням. З аналагічнай праблемай сутыкнуліся і фонды. Па падставах, якія не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, кампетэнтныя органы юрыдычна абгрунтавалі адвольныя адмовы ў рэгістрацыі мясцоваму фонду «Зялёная сетка» (пасля іх трэцяй спробы рэгістрацыі) і мясцоваму інфармацыйна-асветніцкаму фонду «Makeout». Цягам года суды не задаволілі ніводнай скаргі АГС на адмову ў рэгістрацыі. Акрамя таго, некалькі сябраў рэлігійных аб'яднанняў атрымалі папярэджанне за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый.

У 2017 годзе прайшла хваля затрыманняў і пераследаў АГС і актывістаў, у тым ліку з празмерным ужываннем сілы з боку супрацоўнікаў сілавых структур у звязку з удзелам у мірных пратэстах супраць Дэкрэта №3. Рэпрэсіі выліліся ў арышты,ператрусы і канфіскацыю абсталявання ў

офісах АГС і жылых памяшканнях актывістаў, а таксама ў крымінальныя абвінавачванні, у тым ліку ўзбуджэнне крымінальнай справы супраць кіраўніка і галоўнага бухгалтара Беларускага незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП). 25 сакавіка адбыўсяператрус і арышт 58 чалавек у офісе Праваабарончага цэнтра «Вясна», назіральнікі якога ажыццяўлялі маніторынг пратэстаў. У верасні ў Мінску прайшлі адначасовыяператрусы і канфіскацыя тэхнікі ў жылых памяшканнях трох актывістаў грамадскага аб’яднання «Экадом», якія не былі датычныя да арганізацыі пратэстаў. Падобныя выпадкі зафіксаваныя і ў рэгіёнах.

Каб узмацніць кантроль над АГС, якія ўдзельнічалі ў масавых пратэстах, урад распрацаваў законапраект, які вызначае штрафы для юрыдычных асобаў, у тым ліку і АГС, за парушэнне працэдуры правядзення масавых мерапрыемстваў. Да канца 2017 года законапраект знаходзіўся на разглядзе ў парламенце.

Засталася неспрыяльнай і сістэма падаткаабкладання АГС. У 2017 годзе гэтая практыка стала яшчэ больш негатыўнай асабліва для АГС, якія атрымліваюць замежныя сродкі. Прававое рэгуляванне дзейнасці АГС на заканадаўчым узроўні значна не змянілася, аднак дзяржава пачала спаганяць падатак на прыбытак з арганізацый-атрымальнікаў замежных сродкаў і падаходны падатак з фізічных асобаў-атрымальнікаў паслугаў гэтых АГС. Прэзідэнт працягвае асабіста вырашаць, ці павінна тая ці іншая АГС сплочваць 18%-ы падатак на прыбытак з ухваленай замежнай бязвыплатнай дапамогі.

Арганізацыі не аплочваюць падаходны падатак з сяброўскіх унёскаў і ахвяраванняў ад беларускіх фізічных і юрыдычных асобаў, але з заробленага прыбытку аплачваюць такія ж падаткі, як і бізнес. Карпаратыўныя спонсары атрымліваюць падатковыя ільготы за ахвяраванні рэлігійным арганізацыям, дзяржаўным установам сацыяльнага абслугоўвання, спартовым арганізацыям і грамадскім

аб’яднанням, якія пералічаныя ў Падатковым кодэксе, прычым сума ільготы не павінна перавышаць 10% ад іх агульнага гадавога прыбытку.

Доступ арганізацый грамадзянскай супольнасці да фінансавання па-ранейшаму абмежаваны. Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №5 «Аб замежнай бязвыплатнай дапамозе», які пачаў дзейнічаць у сакавіку 2016 года, рэгулюе атрыманне, улік, рэгістрацыю і выкарыстанне такой дапамогі. Прадпрымальніцкая дзейнасць забароненая для грамадскіх аб’яднанняў (найбольш распаўсюджанай формы рэгістрацыі АГС), але ажыццяўляецца некамерцыйнымі ўстановамі, што сярод іншага абумоўлівае рост папулярнасці гэтай арганізацыйна-прававой формы. Грамадскія арганізацыі маюць права ўдзельнічаць у конкурсах на дзяржаўную сацыяльную замову.

У 2017 годзе ўрад у абмежаваным рэжыме зладзіў кансультацыі з АГС па пытаннях змены заканадаўства, якое рэгулюе працэдуры атрымання фінансавання: Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №300 «Аб бязвыплатнай (спонсарскай) дапамозе», Дэкрэта Прэзідэнта №5 «Аб замежнай бязвыплатнай дапамозе» і праекта ўказа аб краўдфандынгавай дзейнасці фінансавых інтэрнэт-платформаў. Аднак цягам года гэтыя ініцыятывы не мелі ніякіх канкрэтных вынікаў, а кансультацыі выглядалі ў значнай ступені простай фармальнасцю.

АГС маюць доступ да неабходнай прававой экспертызы. Асамблея недзяржаўных дэмакратычных арганізацый і Цэнтр прававой трансфармацыі (Lawtrend) дапамагаюць АГС у пытаннях рэгістрацыі, прававых аспектах дзейнасці, пашыраюць інфармацыю пра навіны заканадаўства і прававую практыку, ладзяць асветніцкія і кансультацыйныя мерапрыемствы, а таксама садзейнічаюць укараненню ў практыку АГС сістэмы фінансавага аўдыту.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ: 4.7 (2016: 4.7)



АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ Ў БЕЛАРУСІ

Узровень развіцця арганізацыйнага патэнцыялу АГС Беларусі ў 2017 годзе не змяніўся і працягвае заставацца найбольш моцным параметрам устойлівасці сектара.

Шэраг дасведчаных АГС, сярод якіх мясцовы дабрачынны фонд «Паўночныя Афіны М.К. Агінскага» і грамадскае аб’яднанне «Мінскае роварнае таварыства», маюць дакладнае ўяўленне пра свае мэтавыя групы і прыхільнікаў і актыўна ўцягваюць іх у працэс планавання сваёй дзейнасці. Разам з тым, у рэгіёнах патэнцыял арганізацый грамадзянскай супольнасці застаецца па-ранейшаму слабым.

Буйнейшыя АГС маюць выразна сфармуляваныя місіі, бачанне і стратэгічныя планы. У 2017 годзе пры фінансавай і тэхнічнай падтрымцы донараў новыя стратэгічныя планы з’явіліся ў дзесяці вядучых праваабарончых АГС. Акрамя таго, праваабарончыя арганізацыі супольна распрацавалі звод прафесійных і этычных прынцыпаў дзейнасці праваабаронцаў Беларусі, да якога далучыліся больш за 20 арганізацый. Тым не менш, не ва ўсіх АГС маюцца дакладныя фармулёўкі місій і зразумелыя стратэгічныя планы. Шмат якія невялікія АГС праз моцную залежнасць ад донарскай дапамогі часта без ваганняў адступаюць ад сваіх стратэгічных прыярытэтаў на карысць новых магчымасцяў фінансавання.

Унутраныя сістэмы менеджменту АГС у 2017 годзе істотна не змяніліся. Больш дасведчаныя і развітыя АГС выконваюць ключавыя працэдуры і прынцыпы кіравання арганізацыяй, у тым ліку падзел абавязкаў, працэдуру прыняцця рашэнняў, кадравую палітыку і выбарнасць сябраў кіроўнага органа. Аднак большасць АГС, і ў іх ліку

створаныя адным заснавальнікам некамерцыйныя ўстановы, не прымаюць практычна ніякіх захадаў, каб падзяляць абавязкі паміж кіроўным і выканаўчым органамі, укараняць прынцыпы ўзорнага кіравання і забяспечваць празрыстасць арганізацыі.

Арганізацыям грамадзянскай супольнасці досыць складана ўтрымліваць пастаянных штатных супрацоўнікаў, паколькі аплата персаналу ледзь не цалкам залежыць ад наяўнасці праектаў, якія фінансуюцца донарамі. Скарачэнне вонкавага фінансавання ў 2017 годзе сталася прычынай таго, што АГС былі вымушаныя знізіць і аб’ём сваёй дзейнасці, і колькасць супрацоўнікаў. Пры гэтым, нават працуючы ў афіцыйна зарэгістраваных праектах па працоўных пагадненнях і са службовымі інструкцыямі, штатныя супрацоўнікі звычайна пазбаўленыя сацыяльнай дапамогі, да прыкладу, аплочванага адпачынку. Актывісты, якія доўга працуюць у такіх варунках, застаюцца ў сектары, але ўсё часцей схільныя да выгарання.

Праз скарачэнне фінансавання АГС усё больш спадзяюцца на працу валанцёраў. Некаторыя арганізацыі, асабліва ў моладзевым сектары, да прыкладу, Моладзевы адукацыйны цэнтр «Фіяльта» і Жывая бібліятэка, наогул не маюць штатных супрацоўнікаў і вядуць сваю дзейнасць выключна сіламі валанцёраў. Паводле Сусветнага індэкса дабрачыннасці 2017 года, валанцёрскай дзейнасцю ў 2016 годзе займаліся 22% беларусаў – столькі ж, колькі і летась. АГС могуць пры неабходнасці дазволіць сабе прафесійныя паслугі бухгалтараў, IT-менеджэраў, юрыстаў і спецыялістаў у галіне лічбавай бяспекі, але адчуваюць недахоп экспертаў у фандрэйзінгу.

Большасць АГС валодаюць доступам да сучаснага тэхнічнага абсталявання. Аднак у шэрагу выпадкаў супрацоўнікі арганізацый выкарыстоўваюць для працы сваё асабістае абсталяванне: аўтамабілі, камп’ютары, тэлефоны і праграмнае забеспячэнне. У цэлым, для камунікацый з мэтавымі групамі і прасоўвання сваіх місій АГС актыўна выкарыстоўваюць сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ), у тым ліку такія інструменты, як Facebook, Viber, WhatsApp і Trello.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.4 (2016: 6.3)



ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ Ў БЕЛАРУСІ

Як і ў папярэднія гады, большасць АГС абапіраюцца ў сваёй дзейнасці на замежнае фінансаванне. У 2017 годзе на стан фінансавай устойлівасці АГС негатыўна паўплывалі некалькі фактараў. У іх ліку змена донарскай палітыкі і паранейшаму абмежаваны доступ арганізацый грамадзянскай супольнасці да мясцовых крыніцаў фінансавання. Акрамя таго, дзяржава, са свайго боку, робіць актыўныя спробы спаганяць падатак на прыбытак і падаходны падатак за атрыманую АГС замежную бязвыплатную дапамогу.

Магчымасці АГС дыверсіфікаваць крыніцы фінансавання зменшыліся ў звязку са скарачэннем у 2017 годзе падтрымкі з боку асноўных міжнародных донараў, такіх як Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці, Еўрапейскі Звяз і Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, сухотамі і малярыяй. Да прыкладу, Еўразвяз зменшыў фінансаванне беларускіх АГС у выніку перагляду Еўрапейскай палітыкі суседства.

Структура міжнароднай тэхнічнай дапамогі Беларусі таксама змянілася ў 2017 годзе. Міжнародныя донары ўсё часцей фінансуюць не самастойныя незалежныя АГС, а дзяржаўныя ўстановы і створаныя з ініцыятывы дзяржавы недзяржаўныя арганізацыі (GONGO). Па дадзеных Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), у перыяд з 2007 па 2016 гады 34,6% сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі накіроўваліся на падтрымку АГС; у 2017 годзе гэтая лічба склала менш за 20%. Еўразвяз знаходзіцца ў працэсе ўзгаднення праграмы падтрымкі Беларусі да 2020 года, якая вылучае на АГС толькі блізу 4% ад агульнага аб'ёму сродкаў. Паколькі пераважная колькасць АГС цалкам залежыць ад вонкавага фінансавання, гэтыя змены вымушаюць шмат якія арганізацыі

значна скарачаць маштабы сваёй дзейнасці і аб’ём паслугаў. Да таго ж, доступ АГС да фінансавання з-за мяжы ўскладняецца Дэкрэтам Прэзідэнта №5 «Аб замежнай бязвыплатнай дапамозе».

Хаця большасць АГС працягваюць спадзявацца на замежнае фінансаванне, грамадскія арганізацыі і ініцыятывы робяць спробы прыцягваць сродкі з мясцовых крыніцаў, у тым ліку рэсурсы грамадзянаў і бізнесу. Паводле апытання Міжнароднага агенцтва сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў (МАСМІ), кожны пяты ахвярадаўца дае перавагу ахвяраванням праз інтэрнэт. Адпаведна АГС усё часцей выкарыстоўваюць для збору сродкаў новыя тэхналогіі, да прыкладу, плагіны на сваіх сайтах для пералічэння ахвяраванняў. З 2015 года Фонд дапамогі дзецям «Шанец» выкарыстоўвае мабільны дадатак для прыцягнення ахвяраванняў і падтрымання зваротнай сувязі са спонсарамі.

Краўдфандынг працягвае развівацца ў Беларусі. У 2017 годзе АГС і актывісты сабралі на краўдфандынгавых платформах блізу 600 тысяч доларaў ЗША, што ўдвая больш, чым у 2016 годзе. У адрозненне ад папярэдніх гадоў, больш адчувальных поспехаў у краўдфандынгу дамагліся ініцыятывы, якія займаюцца пытаннямі ЛГБТ+ і правамі чалавека. Так, кампанія BY_help сабрала блізу 55 тысяч доларaў ЗША на дапамогу рэпрэсаваным падчас масавых пратэстаў у Беларусі ў 2017 годзе. Аднак пакуль АГС успрымаюць краўдфандынг хутчэй як разавае рашэнне канкрэтных, у большай ступені сацыяльных і культурных праблемаў, а не як сістэмнае рашэнне для дасягнення фінансавай устойлівасці.

Паводле звестак Сусветнага індэкса дабрачыннасці за 2017 год, колькасць беларусаў, якія ахвяравалі грошы на дабрачыннасць, за 2016 год скарацілася на 4% і склала 20%. У 2017 годзе праз расійскую службу электронных выплатаў «Яндэкс.Грошы» беларускія карыстальнікі ахвяравалі ў 1,2 разы больш сродкаў у параўнанні з папярэднім годам. Сярэдняя сума ахвяраванняў, аднак, пры гэтым знізілася з 23 да 9 доларaў ЗША.

Згодна беларускаму заканадаўству, толькі абмежаванае кола АГС можа атрымліваць спонсарскую падтрымку ад прадпрыемстваў у адпаведнасці са статутнымі мэтамі і дзейнасцю. Беларускі бізнес накіроўвае пераважную колькасць дабрачынных сродкаў або дзяржаўным сацыяльным установам, або наўпрост малазабяспечаным грамадзянам, пры гэтым аддаюць перавагу падтрымцы толькі асобных АГС сацыяльнай сферы. Сярод іх Міжнароднае грамадскае аб’яднанне «Гендарныя перспектывы», якому прадпрыемства электрасувязі «Белтэлекам» у 2017 годзе вылучыла бязвыплатную спонсарскую дапамогу на аплату паслугаў тэлефона гарачай лініі для пацярпелых ад хатняга гвалту.

Лаяльнасць грамадскіх арганізацый да дзяржавы застаецца важным фактарам для атрымання доступу да дзяржаўнага фінансавання. Так, да прыкладу, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі атрымлівае наўпроставае фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту па-за конкурсам.

Мясцовыя органы ўлады працягваюць практыку дзяржаўнай сацыяльнай замовы для АГС на аказанне сацыяльных паслугаў. У 2017 годзе ў бюджэце на гэта было закладзена 460 тысяч долараў ЗША – утрая больш, чым у 2016 годзе. Аднак дадзеная крыніца фінансавання даступна толькі для вузкага кола сацыяльных АГС, якія маюць шчыльныя стасункі з уладамі. Большасць кантрактаў падпісана з Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа.

Большасць АГС не спаганяюць плату за свае паслугі. Арганізацыі, зарэгістраваныя ў форме грамадскіх аб’яднанняў, не маюць права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Іншыя АГС лічаць за лепшае не аказваць платныя паслугі, паколькі звыклі атрымліваць на гэтую дзейнасць замежнае фінансаванне і лічаць, што іх паслугі павінны быць бясплатнымі. Акрамя таго, кліенты АГС часта не маюць сродкаў, каб цалкам аплочваць паслугі.

АГС усведамляюць, што сацыяльнае прадпрымальніцтва можа дапамагчы ў вырашэнні некаторых сацыяльных пытанняў, да прыкладу, пашырыць магчымасці для працаўладкавання людзей з інваліднасцю. У

Беларусі ўжо зарэгістравана блізу 200 сацыяльных прадпрыемстваў, аднак сацыяльнае прадпрымальніцтва пакуль не стала заўважнай крыніцай фінансавай падтрымкі АГС.

Сістэмы фінансавага менеджменту АГС застаюцца слабымі. Шмат якія арганізацыі не маюць сродкаў на прафесійнага бухгалтара і не забяспечваюць празрыстасці кіравання фінансамі. У часе рэалізацыі праграмы грамадскага аўдыту, ініцыяванай Цэнтрам прававой трансфармацыі (Lawtrend), было выяўлена, што ў бухгалтараў шмат якіх АГС адсутнічае належная кваліфікацыя, а стан фінансавай дакументацыі пакідае жадаць лепшага. Гадавыя фінансавыя справаздачы публікуюць у асноўным арганізацыі, якія актыўна прыцягваюць мясцовыя рэсурсы, да прыкладу, Фонд дапамогі дзецям «Шанец» і Беларускі дзіцячы хоспіс.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.2 (2016: 5.3)




АДВАКАТАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ

Параметр «адвакатаванне» ў 2017 годзе ў пэўнай ступені палепшыўся, хаця папранейшаму застаецца слабым. Цягам года грамадзяне і АГС выходзілі на вуліцы пратэставаць супраць «падатку на дармаедства» і актыўна выкарыстоўвалі інтэрнэт-платформы для падачы петыцый. Рэпрэсіі ў дачыненні да АГС за іх удзел у масавых пратэстах не паўплывалі на адвакатыўную дзейнасць сектара.

Хаця ўзаемадзеянне арганізацый грамадзянскай супольнасці і дзяржавы застаецца стрыманым і абмежаваным, у стасунках чыноўнікаў і АГС працягвае назірацца невялікае пацяпленне. Як і ў 2016 годзе,

высокапастаўленыя афіцыйныя асобы ўдзельнічалі ў буйных мерапрыемствах, арганізаваных АГС, у тым ліку ў форуме «Мінскі дыялог» і Кастрычніцкім эканамічным форуме.

У 2017 годзе ўрад ініцыяваў шэраг кансультатыўных мерапрыемстваў з удзелам АГС. Грамадскія арганізацыі ўдзельнічалі ў распрацоўцы Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі ў Рэспубліцы Беларусь палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў на 2017-2025 гады і нарматыўных актаў, якія рэгулююць механізм дзяржаўнай сацыяльнай замовы ў галіне аховы здароўя. Прадстаўнікі праваабарончых АГС прымалі ўдзел у кансультацыях па рэалізацыі Нацыянальнага плана дзеянняў па правах чалавека. Аднак найчасцей у гэтых працэсах у грамадзянскай супольнасці была пасіўная роля. Большасць кансультацый насілі азнаямленчы характар. Дзяржава практычна не прыцягвала АГС ні да абмеркавання важных галіновых пытанняў, ні да фармавання нацыянальных прыярытэтаў, ні да кантролю над рэалізацыяй нават тых нацыянальных планаў, якія былі распрацаваныя з дапамогай АГС.

Бізнес-асацыяцыі і некаторыя АГС атрымалі большае прадстаўніцтва ў грамадска-кансультатыўных радах, у прыватнасці, у грамадска-кансультатыўных радах пры Міністэрстве эканомікі і Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта быў уключаны ў склад Рэспубліканскай грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве юстыцыі.

Грамадскія абмеркаванні з'яўляюцца адным з найбольш даступных для АГС інструментаў адвакатавання. У 2017 годзе беларскімі міністэрствамі было праведзена 51 грамадскае абмеркаванне – столькі ж, як і ў 2016 годзе. Выніковасць грамадскіх абмеркаванняў, аднак, даволі слабая. АГС не атрымліваюць ад дзяржавы адэкватную зваротную сувязь на свае прапановы; часта на грамадскія абмеркаванні адводзіцца недастаткова часу для таго, каб усе зацікаўленыя АГС мелі магчымасць у іх паўдзельнічаць.

У 2017 годзе АГС паспяхова правялі некалькі адвакатыўных кампаній, накіраваных на вырашэнне праблемаў мясцовага і нацыянальнага ўзроўню.

Як адзначалася вышэй, у лютым-сакавіку блізу 20 тысяч чалавек узялі ўдзел у пратэстах, арганізаваных АГС, палітычнымі партыямі і рухамі супраць Дэкрэта №3. Больш за 25 тысяч чалавек падпісалі петыцыю з патрабаваннем скасаваць Дэкрэт №3. У выніку яго дзеянне было фактычна прыпыненае.

Іншыя паспяховыя адвакатыўныя кампаніі былі накіраваныя на абарону ўрочышча Курапаты (месца расстрэлаў ахвяр палітычных рэпрэсій у СССР), перадухіленне зносу гістарычнага і культурнага раёна Мінска Асмалоўкі, скасаванне рашэння аб здачы ў арэнду ўчастка ракі Прыпяць. Дзякуючы намаганням арганізацый людзей з інваліднасцю, у Законе «Аб сацыяльным абслугоўванні» быў пашыраны пералік сацыяльных паслугаў, якія прадстаўляюцца такім людзям. У выніку адвакатыўных дзеянняў АГС, якія аказваюць паслугі ў сферы прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі, людзі, якія жывуць з трэцяй і чацвёртай клінічнай стадыяй ВІЧ, атрымалі права станавіцца прыёмнымі бацькамі і апекунамі. У канцы 2017 года быў прыняты пакет нарматыўных прававых актаў, накіраваных на паляпшэнне дзелавога асяродку ў Беларусі. Дакументы былі распрацаваныя пры актыўным удзеле бізнес-асацыяцый і з улікам прапановаў і рэкамендацый Грамадска-кансультатыўнай экспертнай рады па развіцці прадпрымальніцтва.

У 2017 годзе АГС і грамадзяне яшчэ больш актыўна выкарыстоўвалі інтэрнэт-платформы для стварэння петыцый. Так, колькасць петыцый на сайце Petitions.by павялічылася ў параўнанні з 2016 годам на 55%. Петыцыя «Не Дэкрэту №3 аб «дармаедах» сабрала больш за 25 тысяч подпісаў; каля 15 тысяч чалавек далучыліся да петыцыі «Спыні самавольства ў войску – пратэстуй супраць дзедаўшчыны!». Афіцыйныя адказы на названыя петыцыі, аднак, былі напісаныя фармальна і ў з’едлівым тоне. Хаця па заканадаўстве дзяржаўныя органы абавязаныя разглядаць усе электронныя звароты і даваць адказы на іх, так адбываецца не заўсёды.

У выніку адвакатыўнай кампаніі Асамблеі недзяржаўных дэмакратычных арганізацый і Цэнтра прававой трансфармацыі дзяржава

спыніла практыку прымусовай ліквідацыі АГС, зарэгістраваных у форме некамерцыйных установаў, за неажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці. У цэлым, аднак, намаганні АГС па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе іх дзейнасць, былі малапаспяховымі. Так, у кастрычніку 2017 года 74 арганізацыі падпісалі калектыўны зварот да дзяржавы; зварот быў ініцыяваны грамадскім аб’яднаннем «АКТ» і прапаноўваў палепшыць умовы падаткаабкладання для АГС, аднак кампанія поспеху не мела.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.0 (2016: 5.1.)



АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ Ў БЕЛАРУСІ

Якасць і асартымент паслугаў АГС у 2017 годзе палепшыліся. З аднаго боку, паслугі арганізацый грамадзянскай супольнасці папа-ранейшаму залежаць ад наяўнасці фінансавання, якое ў 2017 годзе скарацілася, з другога – АГС больш выкарыстоўваюць інфармацыйныя тэхналогіі, каб лепш адпавядаць патрэбам не толькі сваіх сяброў і прыхільнікаў, але і іншых мэтавых груп.

АГС аказваюць паслугі ў розных галінах, у тым ліку сацыяльныя паслугі групам, з якімі дзяржава працуе не ў поўнай ступені, – людзям, якія ўжываюць наркотыкі, хворыя на сухоты, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі. Пры гэтым, калі ў сферах адукацыі, дабрачыннасці, арганізацыі вольнага часу, развіцця асобістага патэнцыялу асартымент паслугаў сектара разнастайны, то ў энергетыцы, жыллёвай і сельскай гаспадарцы паслугаў АГС практычна няма.

Усё больш АГС аказвалі свае паслугі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Грамадскае аб’яднанне «Гендарныя перспектывы», Офіс дапамогі і падтрымкі занятасці моладзі «ЮларКонсалт», Асамблея недзяржаўных дэмакратычных арганізацый і іншыя АГС аказваюць сваім кліентам онлайн-кансультацыі. Агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч» у 2017 годзе запусціла мабільны дадатак «Будзь валанцёрам», дзякуючы якому валанцёры могуць хутка даведвацца аб тым, дзе патрэбна іх дапамога, а АГС – распавядаць пра свае ініцыятывы і мерапрыемствы.

У 2017 годзе АГА прапаноўвалі паслугі не толькі сваім сябрам, але і розным іншым мэтавым групам. Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый пачаў кансультаваць па пытаннях вырашэння мясцовых праблемаў актывістаў, мясцовыя супольнасці і АГС; фонд «Інтэракцыя» кансультаваў мясцовыя органы ўлады па пытаннях клімату і энергетыкі ў межах праекта «Пагадненне мэраў – Усход». Аднак прыкладаў, калі АГС аказваюць паслугі дзяржаве, пакуль яшчэ няшмат.

АГС па-ранейшаму больш схільныя вызначаць патрэбы сваіх мэтавых груп і супольнасцяў інтуітыўна, чым праз правядзенне мэтанакіраваных апытанняў і ацэнак. Тым не менш, навучанне і кансультаванне па ацэнцы патрэбаў карыстаюцца высокім попытам сярод новых АГС і мясцовых супольнасцяў. У 2017 годзе Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый правёў больш за дваццаць ацэнак патрэбаў і семінараў па гэтай тэматыцы. Шэраг адукацыйных праграм, да прыкладу, Універсітэт залатога веку і Школа медыя менеджменту, пабудавалі працэс навучання на падставе вынікаў аналізу попыту і патрэбаў патэнцыйных удзельнікаў, што павысіла прывабнасць і папулярнасць гэтых праграм. Аднак больш традыцыйныя АГС неахвотна ўключаюць ацэнку патрэбаў у сваю дзейнасць, паколькі не зусім гатовыя мяняць падыходы да працы ў адказ на зменлівыя патрэбы мэтавых груп. Неабходна таксама адзначыць, што шмат якія, асабліва рэгіянальныя АГС, аказваюць свае паслугі і пры гэтым часта не кіруюцца прынцыпам недыскрымінацыі па прыкмеце расы, полу, этнічнай прыналежнасці або сэксуальнай арыентацыі.

Вельмі нешматлікія АГС кампенсуюць свае выдаткі за аказанне паслугаў за кошт збірання платы за іх або заключэння дамоваў на аказанне паслугаў. Шэраг АГС у 2017 годзе зрабілі платны ўваход на свае мерапрыемствы. Да прыкладу, на Кастрычніцкі эканамічны форум упершыню прадаваліся ўваходныя квіткі.

У 2017 годзе прадстаўнікі мясцовых органаў улады і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны часцей выступалі ў сродках масавай інфармацыі з пазітыўнай ацэнкай дзейнасці АГС. Працягнуў развівацца механізм дзяржаўнай сацыяльнай замовы. Разам з тым, улады і дзяржаўныя сацыяльныя службы працягваюць ўспрымаць АГС і іх паслугі як крыніцу канкурэнцыі.

## ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА: 5.1 (2016: 5.1)



ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА Ў БЕЛАРУСІ

Стан інфраструктуры, якая падтрымлівае сектар АГС у Беларусі, у цэлым застаўся на ранейшым узроўні, хаця ў 2017 годзе завяршыліся некалькі доўгатэрміновых донарскіх праграм па развіцці патэнцыялу АГС, у прыватнасці, праграма ўстановы «Новая Еўразія» па ўмацаванні патэнцыялу сумесных ініцыятываў, якая фінансавалася Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці.

Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый, ОДБ Брусэль, Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый, Прэс-клуб і іншыя грамадскія арганізацыі аказваюць падтрымку АГС, праводзячы для іх трэнінгі і кансультацыі, забяспечваючы прастору для правядзення мерапрыемстваў, абсталяванне і суб-гранты. ОДБ Брусэль цягам года спрыяў развіццю ў краіне сацыяльнага прадпрымальніцтва, праводзячы даследаванні,

маштабныя адукацыйныя праграмы і адвакатуючы неабходныя змены заканадаўства. У Віцебску, Гомелі і Гродна ў межах праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць» працягвалі працаваць тры рэгіянальныя рэсурсныя цэнтры па развіцці дадатковай адукацыі. Гэтыя цэнтры прапануюць трэнінгі для прадстаўнікоў АГС, садзейнічаюць стварэнню сетак АГС, аказваюць юрыдычную дапамогу ў пытаннях адукацыі і даюць грамадскім арганізацыям і ініцыятывам памяшканні для правядзення адукацыйных мерапрыемстваў. Чэшскія арганізацыі «Праскі грамадзянскі цэнтр» і асацыяцыя «Грамадзянская Беларусь» даюць беларускім АГС магчымасці для атрымання грантаў, навучання, абмену досведам і лепшымі практыкамі.

Што датычыць большасці пасярэдніцкіх арганізацый падтрымкі і рэсурсных цэнтраў, то аб’ём і характар іх паслугаў па-ранейшаму значна залежыць ад донарскага фінансавання. Акрамя таго, у рэсурсных цэнтраў існуе праблема ў аб’ектыўнай ацэнцы патрэбаў сваіх мэтавых груп.

Шэраг беларускіх арганізацый аказваюць паслугі па рэгрантынгу, размяркоўваючы сродкі міжнародных донараў сярод мясцовых АГС у розных сферах дзейнасці. Так, у межах праекта «Вучыцца, каб дзейнічаць», які фінансуецца Еўразвязам, Асацыяцыя дадатковай адукацыі і асветы і Прадстаўніцтва DVV International у Беларусі падтрымалі дванаццаць адукацыйных міні-праектаў АГС суб-грантамі ад 9 да 12 тысяч еўра. Гэтыя праекты былі накіраваны на пашырэнне доступу насельніцтва да паслугаў у галіне нефармальнай і грамадзянскай адукацыі. Фонд імя Льва Сапегі пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскай асацыяцыі агенцтваў мясцовай дэмакратыі ALDA размеркаваў па конкурсе восем грантаў на суму ад 5 да 10 тысяч долараў ЗША і тым самым спрыяў удзелу грамадзянаў у вырашэнні мясцовых праблемаў і ўмацаванню супрацоўніцтва паміж АГС і мясцовымі органамі ўлады.

Адукацыйныя праграмы і паслугі АГС цягам года дапамаглі пашырыць магчымасці для грамадзянскага ўдзелу. Цэнтр даследавання грамадскага кіравання «СІМПА» і грамадска-культурніцкая кампанія

«Будзьма беларусамі» навучалі лідэраў мясцовых супольнасцяў у Школе мэраў. Школа медыя менеджменту падрыхтавала групу трэнераў і медыя менеджэраў і дапамагла адкрыць тры рэсурсныя медыяцэнтры. На рэгіянальным узроўні актывісты прымалі ўдзел у адукацыйных праграмах Цэнтра гарадскіх ініцыятываў у Магілёве, віцебскай арганізацыі «Vitebsk4me», Агенцтва рэгіянальнага развіцця «Дзедзіч» у Брэсце і іншых.

Для АГС у 2017 годзе былі даступныя навучальныя мерапрыемствы і праграмы па розных тэмах – кіраванне праектамі, фандрэйзінг, адвакатаванне, развіццё чалавечых рэсурсаў, праца з прыхільнікамі і развіццё іншых навыкаў, неабходных супрацоўнікам і валанцёрам АГС. Як правіла, такія трэнінгі праходзілі ў межах канкрэтных праектаў і аднаразова. Ніводная арганізацыя не прапаноўвала ў 2017 годзе сістэматычнага і комплекснага навучання арганізацый грамадзянскай супольнасці.

У 2017 годзе АГС стваралі тэматычныя кааліцыі для правядзення асобных акцый і мерапрыемстваў, у тым ліку экалагічных акцый «Зробім!» і «Гадзіна Зямлі», Тыдзень студэнта, Тыдзень даступнасці, Форум грамадскіх арганізацый і ініцыятываў «Сакавіцкія сустрэчы». Пяць жаночых і гендарных арганізацый стварылі кааліцыйную платформу для абароны правоў жанчын у Беларусі.

У 2017 годзе палепшыўся ўзровень міжсектарнага супрацоўніцтва. Цягам года высокапастаўленыя чыноўнікі рэгулярна ўдзельнічалі ў мерапрыемствах грамадзянскай супольнасці. Зарэгістраваны ў 2017 годзе сацыяльны фонд «Добра» пачаў працу па папулярызацыі Глабальнай дамовы ААН і тым самым актыўна садзейнічаў развіццю супрацоўніцтва паміж сацыяльна адказным бізнесам, АГС і дзяржавай. У цэлым, аднак, узаемадзеянне паміж грамадскім і прыватным сектарамі ўсё яшчэ знаходзіцца на стадыі станаўлення.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.5 (2016: 5.6)




ГРАМАДСКІ ІМІДЖ Ў БЕЛАРУСІ

Грамадскі імідж сектара арганізацый грамадзянскай супольнасці ў 2017 годзе палепшыўся. АГС працягвалі працаваць на рост пазнавальнасці і бачнасці сваёй дзейнасці, умацоўвалі стасункі з друкаванымі і электроннымі медыя, падтрымлівалі актыўную прысутнасць у сацыяльных сетках і ладзілі публічныя мерапрыемствы.

У 2017 годзе АГС сталі яшчэ больш актыўнымі ў сацыяльных сетках, у тым ліку ў Facebook, УКантакце, Twitter, Аднакласнікі і Instagram, і паспяхова прыцягнулі на свае старонкі значную колькасць падпісчыкаў. Каб зрабіць сваю дзейнасць больш заўважнай, АГС выкарыстоўвалі розныя онлайн-інструменты, у тым ліку запускалі ўласныя каналы, стваралі відэаролікі і прадукавалі прывабны візуальны кантэнт. Паводле даследавання Цэнтра новых ідэй, 12 беларускіх АГС сабралі на сваіх старонках у сацыяльных сетках больш за 10 тысяч падпісчыкаў; самую вялікую прысутнасць у сацыяльных сетках мае пошукава-выратавальны атрад «Анёл» - 145 тысяч падпісчыкаў. Больш за мільён беларусаў сталі гледачамі шоў пра гарадскія ініцыятывы «Горад», якое транслявалася па ключавых медыя і сацыяльных сетках.

АГС запрашаюць журналістаў да ўдзелу ў сваіх мерапрыемствах. У сваю чаргу, у 2017 годзе эксперты з аналітычных цэнтраў, сацыяльна арыентаваных і моладзевых АГС часцей прымалі ўдзел у ток-шоў як на незалежных, так і на дзяржаўных радыёстанцыях і тэлеканалах. Такія онлайн-рэсурсы, як CityDog.by, 34mag.net і Бінокль змясцілі вялікую колькасць пазітыўных матэрыялаў пра ініцыятывы АГС і грамадзянскую

актыўнасць. Тым не менш, цягам года былі і такія выпадкі, калі дзяржаўныя СМІ дэманізавалі АГС па палітычных меркаваннях. Так, афіцыйныя беларускія СМІ арганізавалі кампанію па дыскрэдытацыі групы «Белы легіён», заяўляючы, што яе прадстаўнікі плануюць здзейсніць дзяржаўны пераварот.

За выключэннем выпадкаў мэтанакіраваных рэпрэсій у дачыненні да АГС і актывістаў, якія ўдзельнічалі ў пратэстах супраць Дэкрэта №3, стаўленне ўлады да арганізацый грамадзянскай супольнасці цягам года стала менш варожым. Аднак урад успрымае АГС хутчэй як магчымы канал для прыцягнення ў краіну інвестыцый, чым крыніцу экспертызы. Узаемадзеянне ж паміж камерцыйным сектарам і АГС абапіраецца, галоўным чынам, не на інстытуцыянальныя, а на асабістыя стасункі.

Вынікі розных апытанняў паказваюць, што ў цэлым грамадскасць ставіцца да АГС і актывістаў або пазітыўна, або нейтральна. Паводле даследавання, праведзенага Беларускай аналітычнай майстэрняй па замове Цэнтра даследавання грамадскага кіравання «СІМПА» і грамадска-культурнай кампаніі «Будзьма беларусамі» у снежні 2017 года, 48% беларусаў выказалі давер актывістам. Для параўнання, 44,6% рэспандэнтаў выказалі давер бізнесменам; 39,6% - журналістам; 23,2% - палітыкам і 24,9% - дзяржаўным чыноўнікам. Святары і навукоўцы атрымалі самы высокі ўзровень даверу - 76,7% і 61% адпаведна. Узровень даверу да АГС як да інстытуцый ніжэй, чым да асобных актывістаў, і гэты ўзровень прыкладна аднолькавы і ў дачыненні да прадзяржаўных арганізацый (GONGO), і да незалежных АГС - 29,2% і 24,6% адпаведна.

У кастрычніку 2017 года Міжнароднае агенцтва сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў (МАСМІ) па замове міжнароднай арганізацыі Pact таксама правяло нацыянальнае апытанне. Атрыманыя дадзеныя паказалі, што 26% рэспандэнтаў ведаюць пра дзейнасць АГС, у той час як пераважная большасць - 80% - у дзейнасці арганізацый грамадзянскай супольнасці не ўдзельнічала. Найбольш пашыранымі

формамі ўдзелу сталі фінансавая падтрымка АГС, праца і валанцёрства ў арганізацыях грамадзянскай супольнасці. Агульны ўзровень даверу да АГС склаў 62%, а 37% рэспандэнтаў пазначылі, што не давяраюць АГС.

Апытанне беларускіх інтэрнэт-карыстальнікаў, праведзенае ў студзені 2018 года Офісам еўрапейскай экспертызы і камунікацый і Baltic Internet Policy Initiative, часткова пацвердзіла гэтыя вынікі: 54% рэспандэнтаў ведаюць пра існаванне грамадскіх арганізацый і ініцыятываў, 21% апытаных удзельнічаюць у дзейнасці АГС. Больш за ўсё ў Беларусі вядомыя прафсаюзныя, моладзевыя і спартовыя арганізацыі, а менш за ўсё – тыя АГС, якія займаюцца рэгіянальным развіццём і працуюць з мясцовымі супольнасцямі. Калі б беларусы мелі магчымасць пералічваць 1% сваіх падаткаў на дзейнасць АГС, у першую чаргу яны б падтрымалі сацыяльныя, экалагічныя, адукацыйныя і асветніцкія ініцыятывы.

У 2017 годзе праваабарончыя АГС распрацавалі звод прафесійных і этычных прынцыпаў дзейнасці праваабаронцаў Беларусі. Аднак сектар АГС у цэлым не мае ўласнага этычнага кодэкса. Павялічылася колькасць публічных гадавых справаздачаў АГС, але публікаваць фінансавую інфармацыю большасць арганізацый пакуль устрымліваецца.

Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (CSOSI) з’яўляецца ключавым інструментам вымярэння прагрэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі. Індэкс адсочвае прагрэс грамадскага сектара ў 24 краінах цягам апошняга 21 года. Індэкс вывучае агулам варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, з фокусам на прававы асяродак для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнае развіццё, фінансавую ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктуру і грамадскі імідж. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.

Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб’яднанне “АКТ”, actngo.info@gmail.com.

Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці - 2017 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная на сайце Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці.

**U.S. Agency for International Development**
1300 Pennsylvania Avenue, NW Washington, DC 20523
Tel: (202) 712-0000
Fax: (202) 216-3524
**www.usaid.gov**